*На прастор, на шырокі разлог*
*Выхадзі, мой народ, грамадою...*
*Якуб КОЛАС*

**№№14–15**
**(3144–3145)**

29 студзеня — 1 лютага 2010 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

# Народная Воля

**Да ўвагі!**
**Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!**

**ГОЛАС ЕЎРОПЫ**

## *Перадышка, але не прагрэс...*

Нягледзячы на некаторыя паляпшэнні, у Беларусі па-ранейшаму існуе праблема свабоды прэсы. Пра гэта ў інтэрв'ю БелаПАН заявіў упаўнаважаны АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ **Міклаш ХАРАШЦІ**.

*“Добра, што ў апошнія два-тры гады беларускія ўлады стараліся ўстрымлівацца ад якіх-небудзь накіраваных супраць журналістаў акцый, закрыцця газет, празмернага выкарыстання паўнамоцтваў Міністэрства інфармацыі,* — адзначыў Харашці. — *Але нельга забываць, што законы, якія гэта дазваляюць, усё яшчэ дзейнічаюць, хоць пакуль не прымяняюцца”.*

Харашці падкрэсліў, што адмена заканадаўчых актаў, якія могуць быць скарыстаныя для ціску на журналістаў, стала б “сведчаннем сапраўднага прагрэсу”. *“Пакуль гэта ўсяго толькі перадышка, але ніяк не прагрэс”,* — падкрэсліў ён.

Харашці таксама адзначыў, што ў АБСЕ занепакоены праектам закона аб рэгуляванні беларускай часткі інтэрнэту. *“Як і ў многіх іншых краінах, інтэрнет у Беларусі з'яўляецца практычна адзінай крыніцай рознабаковай інфармацыі,* — сказаў ён. — *Тэлебачанне ў Беларусі не дае магчымасці для плюралізму меркаванняў, становішча незалежных газет вельмі хісткае, таму мы вельмі заклапочаны магчымымі абмежаваннямі ў інтэрнеце”.*

Паводле слоў Харашці, ён накіраваў ліст міністру замежных спраў Беларусі Сяргею Мартынаву, у якім заклікаў зрабіць усё магчымае, каб новы закон не стаў “абмежавальнікам свабоды слова ў інтэрнеце”.

Гаворачы аб тым, што 2010 год у Беларусі з'яўляецца годам выбарчых кампаній, Харашці падкрэсліў, што рэкамендуе беларускім уладам забяспечыць для прадстаўнікоў усіх палітычных партый “доступ да тэлебачання”. *“Для Беларусі тэлебачанне з'яўляецца той крыніцай, з якой большасць грамадзян атрымліваюць інфармацыю, таму ўсе палітычныя партыі павінны мець магчымасць з яго дапамогай данесці свой пункт гледжання”,* — сказаў Харашці.

**АКТУАЛІІ**

# «Чарка на пасашок» — і нашто нам тая бульба?



**Калі б французы развучыліся рабіць віно, швейцарцы — часы, армяне — каньяк, яны б ад сораму павыдзіралі на сабе валасы. А вось нам не толькі не сорамна за тое, што ў "квітнеючай" Беларусі бульба вырадзілася, мы яшчэ і святкаваць гэта збіраемся.**

**Можа, чулі, з ініцыятывай правядзення ў краіне новага штогадовага Свята бульбы выступіў Мінскі аблвыканкам. Пачатак традыцыі хочуць закласці ўжо ў гэтым годзе ў Слуцку. На спецыяльнай прэс-канферэнцыі прадстаўнікі абласной улады паспелі ўжо расказаць журналістам, як яны хочуць падзівіць грамаду размахам гулянкі. Шкада, што не было на той прэс-канферэнцыі старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянона Ломаця. Справа ў тым, што толькі нядаўна КДК па Мінскай вобласці правяраў на Міншчыне выкананне дзяржаўнай праграмы развіцця бульбаводства. І вынікі аказаліся проста скандальнымі. Ну, напрыклад, КДК высветліў, што... Міншчыне гэтай вясной не будзе чым засаджваць палеткі — проста не хопіць насення. Во дажылі!**

**Дарэчы, той факт, што ініцыятыва святкавання сыходзіць ад Мінскага аблвыканкама, — гэта ўвогуле нейкі здзек са здаровага сэнсу. Бо ў мінулым годзе менавіта ў сталічнай вобласці былі самыя нізкія ўраджаі "другога хлеба" па краіне. Як вынік: планавалася, што беларуская бульба, як і ў савецкія часы, пойдзе на экспарт, а на самай справе выйшла, што Беларусь апынулася на мяжы неабходнасці імпартаваць"другі хлеб" . "Бульбашы без бульбы" — гэта сапраўдная сусветная сенсацыя. А які сорам для нацыі!**

**У мінулым годзе з прадуктаў харчавання, бадай, самымі шпаркімі тэмпамі раслі цэннікі на бульбу (кошт павысіўся ў 1,7 раза). У "бульбаводчай дзяржаве" гэта з'яўляецца паказчыкам сапраўднага дэфіцыту "другога хлеба".**

**Дарэчы, не толькі на Міншчыне бульба выradзілася. У цэлым беларускія гаспадаркі ў 2009 годзе сабралі толькі крыху больш за 50% ад гадавога плана — 7 мільёнаў 400 тысяч тон. Планавалася ўраджайнасць у 220 цэнтнераў з гектара, а на самай справе выйшлі толькі па 162, тая ж Міншчына ледзь за 130 цэнтнераў з гектара перавалiла. І гэта, дарэчы, у той час, калі ў краіне аб'яўлена дзяржаўная праграма па развіцці бульбаводства, пад якую выдзелены немалыя грошы вучоным, аграрнікам, вытворцам і тэхнікам. Але... Пад іх "чулым кіраўніцтвам" бульбаводства вярнулася да паказчыкаў 1999 года, адкат на цэлае дзесяцігоддзе назад.**

**Яшчэ адзін прыклад. Нашы афіцыйныя асобы вельмі любяць параўноўваць вынікі сваёй працы з паказчыкамі савецкіх часоў, неяк вельмі цешыць іх выраз "дасягнулі і перасягнулі". Што тычыцца бульбы, то "перасягнулі" толькі па ўзроўні хлусні. Бо ў БССР былі гады, калі рэспубліка збірала нават больш за 15 мільёнаў тон "другога хлеба" ў год — у два разы болей, чым зараз.**

**Толькі няхай не зрываюць голас тыя крытыкі, якія хочуць расказаць мне, што рэалізацыі вялікіх дзяржаўных планаў з года ў год замінае неспрыяльнае надвор'е. Спачатку пацікаўцеся, чаму СВК "Гігант" Бабруйскага раёна яно спрыяла — ураджайнасць бульбы тут склала 467 цэнтнераў з гектара (лічба, дарэчы, пацверджана Дзяржкантролем, так што прыпісак няма). У той час як у большасці іншых гаспадарак ураджай — кот наплакаў.**

**Не трэба спасылацца і на тое, што не было грошай, насення, тэхнікі, угнаенняў... Усё было. Калі ў 2006 годзе прымалася Дзяржаўная праграма развіцця бульбаводства, то на яе фінансаванне было выдаткавана 313 мільярдаў рублёў — больш за мільярд долараў. І вось надышоў 2010-ы — апошні год выканання праграмы. І што мы маем? Выкінутыя грошы. Сапраўды, чаму ж не патанчыць ды не паспяваць?.. "Чарка на пасашок" — і нашто нам тая бульба?!**

**...Я ўжо заканчвала пісаць гэты матэрыял, калі адна наша супрацоўніца расказала гісторыю, што называецца, "у тэму". Выпала ёй некалькі гадоў таму паехаць восенню ў Германію. "Я стаяла і плакала, гледзячы, як немцы бульбу ўбіраюць, — расказала жанчына. — На полі толькі тры чалавекі — вадзіцелі камбайна і двух грузавікоў. Спакойныя, прыгожыя, чысценькія. А як мы душымся на вёсцы, капаючы бульбу?.. Вось глядзела я на ўсё гэта, і слёзы самі каціліся..."**

**Гэта яшчэ адзін штрышок да будучага свята.**

**Святлана КАЛІНКІНА.**

**ТЭМА ДНЯ**

## *Мінус 2,5—3 мільярды долараў з дзяржаўнага бюджэту*

Як лічаць эксперты, менавіта столькі прыйдзецца заплаціць Беларусі ў выніку падпісанага ў Маскве нафтавага пагаднення.

Пад пагрозай спынення працы нафтаперапрацоўчых заводаў Беларусь вымушана была пайсці на расійскія ўмовы пастаўкі нафты нашай краіне. Тактыка энергаблакады аказалася для Крамля паспяховай.

Вынік амаль месячных перамоў ніяк не можа задаволіць Беларусь. Без пошліны Расія пагадзілася паставіць нам толькі 6,3 мільёна тон сырой нафты — роўна столькі, колькі патрэбна Беларусі, каб забяспечыць працу эканомікі краіны. Як падлічылі эканамісты, гэта азначае, што бензін на беларускіх аўтазапраўках павінен стаць дзешавейшым на 30%. Але наўрад ці трэба чакаць такога шчасця, бо адначасова Расія перакрыла Беларусі "вялікі бізнес" па экспарце нафтапрадуктаў, устанавіўшы пошліны на ўсе астатнія пастаўкі сыравіны. Эксперты падлічылі, што ў выніку гэтых дамоўленасцяў Беларусь вымушана будзе аддаваць Расіі 2,5—3 мільярды "нафтадолараў", якія раней траплялі ў беларускі бюджэт. Для нацыянальнай казны гэта азначае цяжкія часы.

Акрамя таго, Расія пагадзілася на павышэнне на 11% тарыфаў на транзіт нафты праз тэрыторыю нашай краіны ў Еўропу, але ў будучым істотна абмежавала для Беларусі магчымасці "іграць на трубе". Пад пагрозай таго, што экспартная пошліна распаўсюдзіцца і на нафту для беларускага спажывання, першаму віцэ-прэм'еру беларускага ўрада Уладзіміру Сямашку прыйшлося падпісваць пагадненні пакетамі: адно — па ўмовах і аб'ёмах паставак "чорнага золата", другое — аб гарантыях транзіту. На сустрэчы з расійскім кіраўніком Дзмітрыем Мядзведзевым віцэ-прэм'ер Ігар Сечын патлумачыў другое пагадненне так: "Яно не дапускае аднабаковага павелічэння тарыфаў, выключэння часткі грашовых сродкаў і ў поўнай меры гарантуе нашы інтарэсы".

"Салодкі пернік" для Мінска пакуль адзін: бакі дамовіліся, што ў верасні яны сустрэнуцца зноў, і, калі Беларусь знойдзе абгрунтаванні (напрыклад, наша прамысловасць прадэманструе значны рост), квота бяспошліннай пастаўкі можа быць павялічана.

**Алена НОВІКАВА.**

**ПАЛІТКУХНЯ**

# Ён сказаў: «Паехалі!» — і махнуў рукой...

**Днямі аб пачатку сваёй передвыбарнай прэзідэнцкай кампаніі аб'явіў былы намеснік старшыні Партыі БНФ, а зараз беспартыйны сябра руху “За Свабоду” Алесь Міхалевіч.**



Вядома, што Алесь даўно мае прэзідэнцкія амбіцыі. Таксама вядома, што канкурэнцыя ў Міхалевіча будзе шалёная. Праўда, наўрад ці хто з іншых прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду зможа здзівіць крэатывам так, як гэта ўдалося Алесю...

Аб'явіць аб старце сваёй прэзідэнцкай кампаніі малады палітык задумаў у... сталічным планетарыі. На прэзентацыю да Міхалевіча прыйшлі сур'ёзныя людзі — палітыкі Ігар Лялькоў, Вячаслаў Сіўчык, грамадскія дзеячы Таццяна Зялко, Антон Астаповіч, Алена Макоўская, журналісты... Агулам набралася некалькі дзесяткаў чалавек.

Усе чакалі “праграмнага” спічу Міхалевіча прама тут, у планетарыі. І да апошняга моманту так і было запланавана. Але... У рэшце рэшт супрацоўніца “зорнага дома” паведаміла, што “планетарый — установа адукацыі, што фота- і відэаздымка тут праводзіцца толькі з дазволу дырэктара, якая зараз знаходзіцца на Старавіленскім тракце, 41...”

Але дазвол на фота- і відэаздымку — гэта яшчэ паўбяды. У самы апошні момант у планетарый патэлефанавалі аднекуль “зверху” і настойліва папрасілі не праводзіць ніякіх мерапрыемстваў з палітычным падтэкстам. А паколькі лекцыю ў планетарыі Міхалевіч ужо замовіў... прысутным прыйшлося яе праслухаць. Лекцыя называлася “Прагулкі па зорным небе”. Было цікава. Пасля яе заканчэння ўсе, хто быў здзіўлены абмяркоўвалі тое, што планета Плутон, аказваецца, аж з 2006 года не ўваходзіць у склад Сонечнай сістэмы...

Пасля завяршэння “культпраграмы” запрошаныя накіраваліся ў бліжэйшую кавярню. Тут Алесь Міхалевіч узышоў на лесвічны пралёт паміж першым і другім паверхамі (можа, для таго, каб усё-ткі быць бліжэй усіх да зор) і, з вышыні гледзячы на прысутных, абвясціў аб старце сваёй прэзідэнцкай кампаніі.

*“Касцяк маёй каманды складуць людзі, станаўленне якіх адбылося ў незалежнай Беларусі. Кампанія будзе рабіцца беларусамі і для беларусаў. Усе фінансавыя сродкі на яе правядзенне будуць знойдзены ў Беларусі”,* — прызнаўся палітык.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што яго падтрымліваюць бізнесмены з Беларусі, а таксама прадстаўнікі беларускай дыяспары ў блізкім замежжы.

Што да пунктаў сваёй перадвыбарнай праграмы, то Алесь палічыў заўчасным іх агучваць: *“Адзінае, што магу сказаць, — мы не за ўладу, мы не за апазіцыю, мы — за Беларусь”.*

Між іншым, Міхалевіч не бачыць неабходнасці здымаць сваю кандыдатуру пад кагосьці з іншых кандыдатаў, хаця вельмі папулярнае меркаванне, што ягоны праект — гэта праца на Мілінкевіча. *“Ужо цяпер зразумела, што адзінага кандыдата не будзе, таму не бачу сэнсу гэта рабіць. Я іду як незалежны беспартыйны кандыдат”,* — заявіў палітык.

Прэзентацыя пачатку прэзідэнцкай кампаніі Алеся Міхалевіча скончылася сімвалічна. Паўстаўшы на фоне ўсталяванага ў зале экрана, на якім быў паказаны старт ракеты, палітык прамовіў: “Паехалі!”. І махнуў рукой...

**Антон ВІТАЛЬЕЎ.**

**БЛІЦ**

# Ці здольна ваша партыя (рух) правесці хоць аднаго свайго кандыдата ў Мінскі гарадскі Савет народных дэпутатаў?

**Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі:**

— Калі б выбары ў Беларусі былі сапраўды выбарамі, то прадстаўнікі АГП проста занялі б палову дэпутацкіх месцаў у Мінскім гарадскім савеце дэпутатаў. Але, улічваючы тое, як выбары праводзяцца ў нас насамрэч, калі падчас працы выбарчых камісій іх сябры праяўляюць майстэрства, вартае шулераў і напарстачнікаў, то ні адна страхавая кампанія ў свеце не возьмецца гарантаваць вам тое, што хоць адзін дэмакратычны кандыдат выйграе выбары.

**— А што, у вашай партыі недастаткова сіл, каб узяць пад шчыльны кантроль хаця б адзін з участкаў, дзе будзе балатавацца ваш кандыдат?**

— Асаблівага сэнсу ў тым, каб расстаўляць “кантралёраў”, няма, бо цалкам верагодны той факт, што нашы з вамі галасы ніхто не будзе лічыць — патрэбныя ўладзе лічбы загадзя ўнясуць у пратаколы. Падлік галасоў стане сапраўды празрыстым, калі ў складзе кожнай з камісій будзе хоць некалькі чалавек, якія не залежаць ад гэтай улады... Верагоднасць гэтага, вы самі разумееце, мізэрная...

**Анатоль ЛЯЎКОВІЧ, старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада):**

— Добрае пытанне... У прынцыпе, я лічу, што наша партыя на гэта здольная. Іншая праблема ў тым, што і самі партыйцы, і выбаршчыкі расчараваны — выбараў у нас няма. Празрыстыя і справядлівыя выбары ў суверэннай Беларусі, на вялікі жаль, не сталі традыцыяй. У нас спрацоўвае правіла: не важна, як галасуюць, а важна, як лічаць галасы і якія канчатковыя лічбы ўносяцца ў пратакол...

**— А не думалі над тым, каб узяць пад пільны кантроль хаця б тыя ўчасткі, дзе будуць балатавацца найбольш моцныя кандыдаты ад партыі? Ці хопіць у вашай партыі на гэта людзей?**

— Хоць у нашай партыі не так шмат людскога рэсурсу, але мы здольныя арганізаваць кантроль за галасаваннем у той акрузе, па якой будзе вылучацца наш кандыдат... Праўда, яшчэ раз паўтаруся, нават пры такім падыходзе няма ўпэўненасці ў справядлівым падліку галасоў...

**Мікалай СТАТКЕВІЧ, старшыня аргкамітэта па стварэнні Сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада):**

— Дзіўнае пытанне... Бо праблема палягае не ў тым, як, скажам, кандыдатам ад нашай партыі заваяваць галасы выбаршчыкаў. Праблема якраз-такі ў тым, што, магчыма, гэтыя галасы ніхто не будзе лічыць... Але... Асаблівасць мясцовых выбараў такая, што з-за невялікай колькасці і адносна малой тэрыторыі выбарчых акруг сістэма фальсіфікацый, адладжаная ўладай, дае збоі... Сведчанне гэтаму тое, што пяцёра нашых партыйцаў былі абраныя ў мясцовыя саветы падчас мінулых выбараў.

Адсочваць ход галасавання на тых акругах, дзе будуць балатавацца нашы кандыдаты, мы будзем. Іншая справа, што калі пачынаецца падлік галасоў, назіральнікаў звычайна просяць адысці далей ад стала, на якім падлічваюць бюлетэні.

**Сяргей КАЛЯКІН, старшыня партыі “Справядлівы свет”:**

— Безумоўна, мы на гэта здольныя, калі выбары сапраўды будуць выбарамі...

**Віктар КАРНЯЕНКА, намеснік старшыні руху “За Свабоду”:**

— Так, рух “За Свабоду” на гэта здольны. Для гэтага ў нас ёсць як чалавечы рэсурс, так і адпаведны досвед. Праўда, калі сітуацыя з выбарамі не зменіцца, то гарантаваць тое, што ў дэпутаты пройдуць прадстаўнікі апазіцыі, можа толькі недасведчаны чалавек.

**— І ўсё ж такі акругі на мясцовых выбарах значна меншыя, чым на парламенцкіх альбо прэзідэнцкіх. Ці “закрыеце” вы назіральнікамі хаця б тыя, дзе будуць самыя вялікія шанцы на перамогу вашых кандыдатаў?**

— Каб выбары прайшлі сумленна, аднаго назірання мала. Для гэтага патрэбна палітычная воля ўлады. А механізмы для справядлівага правядзення выбараў ёсць — гэта можа быць і ўключэнне ў камісіі апанентаў улады, і сумленны падлік галасоў...

**Юрась БЕЛЕНЬКІ, намеснік старшыні КХП-БНФ:**

— У нас няма ні выбараў, ні Мінскага гарадскога савета дэпутатаў. Я, як чалавек, які ў свой час быў і дэпутатам Мінскага гарадскога савета, і дэпутатаў Вярхоўнага Савета, з усёй адказнасцю скажу, што Мінскі савет дэпутатаў зараз не з'яўляецца прадстаўнічым выбарчым органам. Дэпутатаў сюды не выбіраюць, а прызначаюць. Таму слова “правесці” ў пытанні падаецца некарэктным. Таму што чалавека можна правесці ў дэпутаты, калі ёсць магчымасць для адкрытага спаборніцтва. Такой магчымасці няма.

Наша партыя паслядоўна заклікае грамадзян да няўдзелу ў выбарах. Таму што тыя, хто ўдзельнічае ў гэтай фальшыўцы, гуляюць па правілах улады, удзельнічаючы ва ўладным праекце...

**Павел СЕВЯРЫНЕЦ, адзін з сустаршыняў аргкамітэта па стварэнні партыі “Беларуская хрысціянская дэмакратыя”**

— Беларускія хрысціянскія дэмакраты, безумоўна, на гэта здольны. У Мінску будуць вылучаны 15 кандыдатаў.

**— Ці хопіць у вас сіл, людскога рэсурсу, каб не даць уладам магчымасці сфальсіфікаваць вынікі галасавання?**

— Зразумела, што на чарговых мясцовых выбарах магчымы фальсіфікацыі. Аднак толькі ў Мінску каля 500 сяброў БХД. Сіл на тое, каб не дапусціць фальсіфікацый, у нас хопіць. Таму пад пільную ўвагу, пад узмоцненае назіранне будуць узятыя тыя акругі і ўчасткі, дзе будуць балатавацца актывісты БХД.

**Ігар ЛЯЛЬКОЎ, намеснік старшыні Партыі БНФ:**

— Па сваім патэнцыяле, па здольнасцях партыйцаў, безумоўна, наша партыя на гэта здольная. Але ўсё будзе залежаць ад таго, наколькі справядлівым будзе падлік галасоў. Безумоўна, мы будзем прапаноўваць сваіх людзей і ў якасці назіральнікаў, і ў якасці сяброў участковых камісій. Праўда, канкрэтную колькасць гэтых людзей я пакуль назваць не гатовы...

**Станіслаў ШУШКЕВІЧ, старшыня Беларускай сацыял- дэмакратычнай грамады:**

— Цікавае пытанне... Шчыра кажучы, у партыйцаў няма жадання прымаць удзел у гульні пад назвай “выбары”. Рашэнне аб удзеле ў мясцовых выбарах мы будзем прымаць пасля фарміравання выбарчых камісій. Калі змены ў гэтым накірунку адбудуцца, калі ў камісіі дапусцяць прадстаўнікоў апазіцыі, можна будзе ўдзельнічаць. А так... Навошта марнаваць час, калі ў дэпутаты трапяць тыя, каго прызначаць?

**Апытанне праводзіў Віталь ГАРБУЗАЎ.**

**ОФИЦИОЗ**



# Дело о взрыве в Минске может быть раскрыто. Но когда — не известно

*Об этом на своей первой пресс-конференции в качестве министра внутренних дел сказал генерал Анатолий Кулешов.*

Напомним, что Кулешов еще и года не работает министром.

### О взрыве

*Экс-министр внутренних дел Владимир Наумов однажды заявил, что не уснет и в отпуск не уйдет до тех пор, пока не будет раскрыто уголовное дело о взрыве, прозвучавшем в Минске в ночь на 4 июля в 2008 году.*

*“Народная Воля” поинтересовалась у Кулешова, перехватил ли он “бессонную” эстафету у своего предшественника и есть ли уже какие-то результаты расследования.*

— Так сразу сказать, что сегодня, завтра, послезавтра или в течение одного года это дело будет раскрыто, я не могу. Объясню: мы в текущем году раскрыли 17 убийств, которые были совершены в 2001—2007 годах. Нераскрываемых преступлений нет. Пройдет время, и, я убежден, это преступление будет раскрыто. Мы работаем над этим делом, не замыкаясь только в своем собственном ведомстве. Работают над этим преступлением буквально все, кто имеет возможность оказать любую посильную помощь. Поэтому, подводя итог, могу сказать, что перспектива для раскрытия этого преступления у нас имеется.

### О громких исчезновениях

*“Народная Воля” спросила у министра, что, на его взгляд, мешает поставить точку в делах о громких исчезновениях.*

— Если бы у меня все остальные люди, находящиеся в розыске как без вести пропавшие, были найдены все до одного, (а у меня их тысячи), то я бы сказал, что мне ничего не мешает, — *ответил генерал.* — Но поскольку дела, о которых вы спрашиваете, находятся в общем списке со всеми без вести пропавшими, остается только одно — искать. Причем искать всех.

**— Вы говорили, что нет нераскрываемых преступлений. Значит, дела Юрия Захаренко, Виктора Гончара, Анатолия Красовского и Дмитрия Завадского тоже будут обязательно раскрыты?**

— Я так не говорю. Но нет нераскрываемых дел! Хотя, может быть, по не от нас зависящим причинам, в силу нашего профессионализма, в силу каких-то других причин мы не можем дойти до истины...

**БЕЗ ГАЛСТУКА**

*В отличие от своего предшественника генерала Владимира Наумова Анатолий Кулешов пока не имеет загородного коттеджа и не испытывает большой любви к хоккею.*

— Коттедж не строю, живу в трехкомнатной квартире, имею приватизированную дачу, — *с улыбкой рассказал о себе генерал.* — И квартира, и дача меня устраивают полностью, и мне пока большего не надо...

Что касается спорта, то, наверное, легче перечислить те виды, которыми я не занимался... Начинал с легкой атлетики, многоборья, самбо, дзюдо. Затем — гиревой спорт, милицейское многоборье: метание гранаты, подтягивание на перекладине, плавание, кросс, стрельба из пистолета. В последний раз в 1987 году выступал на чемпионате БФСО “Динамо” — занял третье место по самбо.

Будучи начальником ГУВД, был капитаном хоккейной команды ГУВД. Но у меня не совсем как-то получилось... Было даже немножко стыдно за то, что я был настолько самоуверенным, что после долгого перерыва вновь решился встать на коньки, на которых не стоял лет, наверное, 25. Мне подчиненные сказали: мол, вы, наверное, уже не сможете поехать, но я сам себе сказал: нет, смогу. И, в общем-то, для такого перерыва я неплохо держался на льду. Смог даже, стоя на коньках, сказать приветствие...

**Марина КОКТЫШ.**

РАЗБОР ПОЛЕТОВ

# Не каждый день в Беларуси самолеты конфискуют...

**В прошлом году услышал, что какая-то фирма из Смолевич купила самолет за 700 миллионов рублей. Но его конфисковали таможенники. Расскажите, чем в итоге закончилось дело? Что это за фирма и зачем ей нужен был самолет (кстати, что это был за аппарат)? И где он теперь, кто на нем летает?**

**Интересуюсь, потому что не каждый день у нас в Беларуси покупают и конфискуют самолеты...**

**Игорь ВЛАДИМИРОВ, Минск.**




*Самолет Ан-26Б ООО "Генекс". Фото с сайта компании.*

В минувшем году многие средства массовой информации действительно сообщили про конфискованный самолет Ан-26Б 1983 года выпуска, прибывший в Беларусь из Украины в конце октября 2008 года на адрес фирмы, зарегистрированной в Смолевичах. Летательный аппарат был оформлен в государственном реестре гражданских воздушных судов. Около полугода самолет активно использовался для перевозки грузов. А потом выяснилось, что владелец воздушного судна не заплатил необходимые пошлины. В прессе со ссылкой на специалистов Государственного таможенного комитета сообщалось, что владелец самолета должен был заплатить за растаможку около 40 процентов от стоимости летательного аппарата.

## Что за фирма?

Как удалось узнать "Народной Воле", самолет принадлежал ООО "Генекс". Эта компания была зарегистрирована в 1997 году на территории аэропорта "Минск-2" как таможенное агентство и транспортно-экспедиционное предприятие по осуществлению перевозок грузов в международном сообщении авиационным и автомобильным транспортом.

В июле 2003 года руководство фирмы приняло решение развиваться как частная авиакомпания. Был приобретен первый самолет Ан-2, выполнявший полеты на геомагнитную съемку, десантирование парашютистов, авиахимработы. В 2006 году компания стала выполнять грузовые авиаперевозки самолетами Ан-26Б по международным воздушным линиям.

Сегодня ООО "Генекс" дважды в неделю выполняет регулярные чартерные рейсы Минск—Лейпциг—Минск, регулярные рейсы Таллинн—Хельсинки.

"Генекс" предлагает полный комплекс таможенных услуг, грузовые перевозки по внутренним и международным авиалиниям самолетами Ан-26Б, авиационные работы в воздушном пространстве Республики Беларусь и за ее пределами.

## Что за самолет?

Грузовой самолет местных воздушных линий Ан-26Б предназначен для транспортировки колесной техники, крупногабаритных грузов.

Самолет оборудован электролебедкой, грузоподъемностью до 500 кг.

Наличие откидных сидений позволяет перевозить на борту самолета служебных пассажиров, лиц, сопровождающих груз.

На самолете применена система раздельного обогрева грузовой кабины и кабины экипажа, что позволяет поддерживать в грузовой кабине температуру воздуха в зависимости от перевозимого груза в широком диапазоне температур.

Максимальная взлетная масса - 24.000 кг.

Максимальная скорость для длительных режимов эксплуатации — 450 км/ч.

Дальность полета с грузом 3300 кг — 2000 км, с грузом 6300 кг — 400 км.

## Официально

Начальник управления организации борьбы с контрабандой и административными таможенными правонарушениями Государственного таможенного комитета Беларуси **Андрей Михалькевич** подтвердил "Народной Воле", что компания, у которой конфисковали самолет, нарушила таможенное законодательство.

— *Самолет конфискован решением суда в собственность государства*, — говорит Андрей Владимирович. — *Компания была виновна в нарушении таможенного законодательства. Вина выражалась в том, что данный самолет был приобретен белорусской компанией, ввезен на территорию страны, но не оформлен в таможенном отношении: таможенные платежи не были уплачены. При этом ссылки на то, что компания не владела информацией о том, что такие требования предъявлялись законодательством по оформлению авиационных транспортных средств, мы посчитали несостоятельными в силу того, что у компании уже были иные авиационные транспортные средства, которые были надлежащим образом оформлены в таможенном отношении. Напомню, что суд Смолевичского района рассмотрел это дело и конфисковал в собственность государства данный самолет. Решение осталось без изменений. И дальнейшее распоряжение самолетом уже осуществляется от имени государства. ГТК уже никакого отношения к этому самолету не имеет.*

## Звонок на фирму

В компании "Генекс" от каких бы то ни было комментариев отказываются.

По неофициальной информации, фирма еще не оставляет надежды вернуть свой самолет...

**Марина КОКТЫШ.**

АФІЦЫЙНА

## *Для бедных і мінімум бедны*

Пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі ўстаноўлены памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў у сярэдніх цэнах снежня 2009 года для розных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва. Гэтыя нарматывы будуць дзейнічаць з 1 лютага па 30 красавіка 2010 года.

Сярэднедушавы мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек з 1 лютага гэтага года складзе 395 тысяч 20 рублей у разліку на месяц. На дадзены момант вызначаны мінімум 387 тысяч 690 рублёў.

Мінімальны спажывецкі бюджэт прымяняецца як сацыяльны нарматыў для прагназавання змяненняў узроўню жыцця насельніцтва і дзяржаўнай падтрымкі маючых у гэтым патрэбу грамадзян. Але відавочна, што дзяржава не вельмі спяшаецца гэтую самую падтрымку аказваць, таму і памеры "мінімуму" проста смешныя. Ну як чалавек можа месяц пражыць на 100 тысяч рублёў?..

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

## *Прафсаюз «Разам» не зарэгістравалі*

Міністэрства юстыцыі адмовіла ў рэгістрацыі прафсаюзу "Разам", які спрабавалі стварыць актывісты прадпрымальніцкага руху.

Як паведамляе прэс-служба Мінюста, па прадстаўленых дакументах колькасць заснавальнікаў прафсаюза "Разам" складае 588 чалавек. Аднак падчас праверкі высветлілася, што па пратаколах агульных сходаў па вылучэнні дэлегатаў заснавальнікаў было толькі 462. Акрамя таго, паводле інфармацыі Мінюста, было знойдзена яшчэ шмат недарэчнасцяў.

Заснавальнікі прафсаюза "Разам" з рашэннем Міністэрства юстыцыі катэгарычна не згодны. Паводле меркавання Ірыны Яскевіч, як толькі заснавальнікі атрымаюць афіцыйны адказ, то абскардзяць яго ў Вярхоўным судзе.

Прафсаюз "Разам" па сваім статуце збіраўся бараніць правы дробных прадпрымальнікаў і фермераў.

КРЫМІНАЛ

## *Дагуляўся...*

**Напярэдадні Новага года трапіў за краты следчага ізалятара 32-гадовы жыхар Віцебска Ігар К., які, паводле слоў начальніка Чыгуначнага РАУС абласнога цэнтра Сяргея Блажэвіча, дагэтуль не меў аніводнага канфлікту з законам і нават ніколі не затрымліваўся міліцыяй.**

Злашчасным паваротам у сваёй біяграфіі бацька двух малых дзяцей (малодшаму — менш за год) "абавязаны" пакуль што рэдкаснай хваробе — лудаманіі, альбо ў перакладзе — гульняманіі, што разам з распаўсюджваннем казіно дабралася і да нашых мясцін.

Пазнаёміўшыся ў верасні 2009 года з гульнявымі аўтаматамі, Ігар К. стаў рэгулярна бавіць час у залах, дзе ўсталяваны "аднарукія бандыты", як завуць гэтыя аўтаматы на Захадзе. Неўзабаве нармальны мужчынаператварыўся ў апантанага гульца. За восень 2009 года на марныя спробы ўзбагаціцца гульнёй з сямейнага бюджэту пайшло каля 3 мільёнаў рублёў.

Зранку 19 снежня жонка дала Ігару 100 тысяч рублёў на прадукты і памперсы, але замест набыцця неабходнага бацька сямейства накіраваўся ў залу гульнявых аўтаматаў, што ў цэнтры Віцебска, на Замкавай вуліцы, і прайграў усе грошы.

Няўдача не спыніла Ігара, а штурхнула яго на злачынства. Пагражаючы нажом, ён адняў у касіркі залы выручку — амаль 140 тысяч — і хутка прайграў здабычу.

А ўвечары таго ж дня раз'юшаны гульняман уварваўся ў павільён на ўскрайку горада і з нажом кінуўся на гандлярку, патрабуючы грошы. Але на гэты раз яму было аказана супраціўленне, выклікалі міліцыю...

Наступным днём з дапамогай сведак і запісу, зробленага відэакамерай у зале гульнявых аўтаматаў Ігар К. быў знойдзены і затрыманы. Віны сваёй ён не адмаўляе, а злачынныя паводзіны тлумачыць дужа моцным жаданнем адыграцца...

У дачыненні да гульнямана ўзбуджана крымінальная справа за напад з гвалтам, небяспечны для жыцця і здароўя, паўторна (частка 2 артыкула 207 Крымінальнага кодэксу РБ), што прадугледжвае пакаранне ад 6 да 15 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

**Сяргей БУТКЕВІЧ.**

САМОУПРАВЛЕНИЕ: ГРАНИ ПРОБЛЕМЫ

# О глухих чиновниках и бесправной общественности

На мой взгляд, к важной теме периодически возвращается "Народная Воля" — о самоуправлении в регионах, на низовых уровнях жизни людей. Может, обнаглевшим чиновникам и не хочется отдавать часть своих полномочий общественности, но придется — весь цивилизованный мир идет по этому пути.

Я хочу обратить внимание на такие аспекты проблемы. Почему те, кто сегодня у власти, не хотят ею делиться, отказываются прибегать к помощи местного населения в решении многих актуальных проблем жизнеустройства данной территории? Знают: многое потеряют в личном плане. Чего греха таить, районные князьки — именно так называют в народе тех начальников и начальничков, которые потеряли совесть, по уши погрязли в коррупции. Им что, глас народа нужен? Ни в коем случае! А потому я, например, не припомню случая, чтобы в каком-нибудь районе устроили публичное обсуждение вопроса, как лучше, эффективнее использовать бюджетные деньги. Все решается как будто голосованием тех, кто входит в местный Совет. Но это чистая формальность, ставится галочка, что тот или иной вопрос обсужден депутатами, а фактически все было решено до этого, в кабинетах тех же чиновников. Если уж говорить о роли депутатов, то мы знаем, кто и как ими становится. Давайте скажем честно: у многих из них на первом плане личные интересы, а не общественные. А сколько таких, кто, случайно попав в депутатское кресло, умеет лишь в рот заглядывать большим начальникам, а не отстаивать общественные интересы?

Передача части полномочий госорганов общественным структурам местного самоуправления — это, считаю, действенное средство борьбы с коррупцией. Теперь некоторые циничные начальники "отмывают бабки" буквально на каждом шагу. Все выгодные объекты, торговые закупки-продажи — "своим" людям, а что не представляет выгоды — на открытый аукцион. А если принять соответствующие законы и решение многих вопросов передать общественным объединениям, то будет, не сомневаюсь, нанесен сильный удар по коррупционерам. Понесут потери нечистоплотные чиновники, но выиграет государство и в конечном счете — народ. Вот почему я двумя руками голосую за развитие структур местного самоуправления, укрепление их авторитета, придания им положенного статуса.

Хочу изложить конкретные предложения по конкретным позициям. Возьмем те же агрогородки, которых в стране уже более тысячи. Сколько критических стрел летит в них со стороны тех же сельчан! Что, идея плохая? Я бы не сказал. Вымирание многих деревень — естественный процесс, от него никуда не уйдешь. Все условия современной цивилизации трудно подвести в каждый деревенский дом. Поэтому и нужно строить типовые агрогородки. Но тут возникает миллион вопросов. И многие из них никто не решит лучше, чем те, кто будет жить в этих агрогородках. А почему не слышно, чтобы где-нибудь обсуждение и решение их власть передала в руки общественности, тех же деревенских жителей? Видите ли, архитектору легче всего нарисовать один проект дома — и стройте под шнурочек целую улицу из коттеджей-близницов. А то что это выглядит, мягко говоря, безобразно — кого из чиновников волнует? Предлагаю: без экспертизы общественности не приступать к возведению ни одного нового агрогородка.

А как решаются вопросы, связанные с выделением земельных участков рядом с большими городами? Ответственность за это как будто возложена на местные сельские Советы. Но можно привести немало примеров, когда всё обтяпывалось в тиши председательских кабинетов. Нарушения законов выявляются тогда, когда чиновник, нажившись сам и облагодетельствовав своих ближних, пересел в другое кресло, а что-либо исправить уже практически невозможно. Чтобы резко искоренить коррупцию на низах, вношу такое предложение: что касается решений сельских Советов о выделении земли, то они обязательно должны проходить экспертизу общественности, то есть структур местного самоуправления.

Я был за границей, знаю, как управляются местные территории там. В муниципальных офисах совсем немного чиновников, все жизненно важные вопросы решаются с привлечением широкой общественности. Региональные референдумы — обычная практика. А у нас? Вы слышали, чтобы подобным образом решались узловые вопросы, скажем, в Лельчицком или Ивьевском районах? Я лично не слышал. Да что говорить об отдаленных сельских районах?! В Беларуси, кроме столицы, немало крупных городов — Гомель, Могилев, Витебск, Брест, Гродно, Солигорск, Новополоцк, Бобруйск, Барановичи, Жлобин... Власть советуется с общественностью? Нет, конечно. Хотя необходимость в этом есть. И большая. Я не против тех же ледовых дворцов, но, скажите, пожалуйста, первоочередные ли это объекты в тех городах, где тысячи людей не имеют крыши над головой, где остро стоит проблема детских учреждений, школ, благоустройства улиц, дворовых территорий? Тут бы опираться на мнение общественности, а не рубить сплеча! Авторитет власти от этого только поднимался бы, как и благосостояние рядовых людей!

Я никогда не соглашусь с тем, что того же председателя сельского Совета должен назначать райисполком. В таком случае первый не несет никакой ответственности перед теми же местными жителями, для него главное — смотреть в рот тому, кто его назначил. А чиновничьи интересы, прямо скажем, не всегда совпадают с интересами простых людей. Им там жить, работать — пусть они и выбирают того же председателя сельсовета. Он будет знать: его карьера зависит не от районного начальника с его капризами, коррупционными замашками, а от тех, кто живет по соседству, с кем каждый день встречаешься, решаешь те или иные жизненные вопросы. Естественно, при таком варианте любой председатель сельсовета десять раз подумает, прежде чем один раз нагрубить тому же местному деревенскому жителю. А главное — он вместе с ним будет решать и все локальные вопросы.

Жаль, что газетная площадь не позволяет порассуждать шире и глубже по очень актуальной проблеме. Но я надеюсь, что "Народная Воля" позволит мне это сделать в другой раз.

**Василий ХОТЯНОВСКИЙ, пенсионер, в прошлом специалист сельского хозяйства.**

ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО...

## *Малпы ў Гродзенскім заапарку аддаюць перавагу гарачай гарбаце*

**По словах спецыялістаў, усяго ў заапарку пражываюць 11 малпачак. Гэта такія асобіны, як макак-рэзус, яванскі макак, гамадрыл, лапундэр, чырвоная мартышка.**

Гарачую чорную гарбату малпы п'юць штодня, але з задавальненнем ужываюць яе асабліва зараз — у халодную зімнюю пару. Да традыцыйнага напою, які малпы п'юць з глыбокіх місак, падаецца таксама батон з павідлам і пячэнне. Фізіялогія малп падобная на чалавечую, гарачае і салодкае падтрымлівае іх жыццёвы тонус, адзначылі ў заапарку.

## *Продаж новых аўтамабіляў у 2009 годзе скараціўся на 40 працэнтаў*

**Пра гэта са спасылкай на даныя Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі (БАА) паведаміў на прэс-канферэнцыі піяр-менеджэр імпарцёра Volkswagen у Беларусі Аляксандр Бабко.**

Летась аб'ём продажу новых аўтамабіляў у Беларусі (як расійскіх, так і іншамарак) склаў 18.574 адзінкі. Пры гэтым продаж новых расійскіх аўтамабіляў скараціўся на 61% (да 2107) супраць 35-працэнтнага падзення замежных (да 16.467), паведамляе БелаПАН.

АД ШЧЫРАГА СЭРЦА

# Дзякуй вам, добрыя людзі, дзякуй «Народнай Волі»!

Напрыканцы мінулага года ў "Народнай Волі" быў змешчаны мой матэрыял пад назвай "Мама Люба і Валодзя". У ім я расказала пра гаротны лёс сям'і Луня з Дзятлава. Любоў Дзмітрыеўна і яе прыёмны сын Валодзя, які больш як паўтара года прыкаваны да ложка ў выніку цяжкага калецтва, знаходзіліся ў вельмі дрэнным становішчы. Акрамя таго, што ў Валодзі поўнасцю перарваны спінны мозг, у яго хворыя ныркі: перанёс некалькі аперацый і цяпер вымушаны пастаянна ляжаць з трубачкамі, што выведзены з арганізма.

Сама Любоў Дзмітрыеўна перанесла аперацыю з выпадку анкалагічнага захворвання, прайшла хіміятэрапію. Бацькі ў Валодзі няма: некалькі гадоў таму яго насмерць збіла машына...

Я шчыра прасіла шаноўных чытачоў "Народнай Волі" адгукнуцца на непапраўнае гора сям'і Луня, дапамагчы маме Любе і Валодзю матэрыяльна, падтрымаць іх маральна. Не сумнявалася, што людзі не застануцца раўнадушнымі. Але каб такое! Ужо на трэці дзень пасля таго, як выйшаў нумар "Народнай Волі" з гэтым матэрыялам, мне пазваніла Любоў Дзмітрыеўна і са слязамі ў голасе прамовіла:

— Толькі што паведамілі з пошты: там ляжаць пяць грашовых пераводаў на маё імя... Якія ж добрыя, якія спагадлівыя людзі чытаюць "Народную Волю"! Зямны паклон ім. А таксама шчыры дзякуй газеце, яе заснавальніку і галоўнаму рэдактару Іосіфу Паўлавічу Сярэдзічу... Ды і ўсім, хто там працуе. Атрымаўшы грашовыя пераводы, я адразу ж выпішу "Народную Волю" на тры месяцы і больш ніколі не расстануся з гэтай цудоўнай газетай.

Але гэта быў толькі пачатак. Паштовыя пераводы на імя Любові Луня пачалі прыходзіць кожны дзень па некалькі штук. Хачу назваць імёны гэтых чулых, бескарыслівых людзей, для якіх няма чужога болю:

**Раіса Міхайлаўна БАБКО** з вёскі Палеская Пінскага раёна;

па благаславенні **айца Ігара** — прыхаджане Валковіцкага храма Навагрудскага раёна;

**Фаіна Іосіфаўна КАЛЕНТА** з вуліцы В.Харужай у Мінску;

**Тамара Міхайлаўна БОБРЫК** з вуліцы Горкага ў Гродне;

**Людміла Міхайлаўна ВАЦУРА** з Хоцімска Магілёўскай вобласці;

**Людміла Сямёнаўна ХАРОШКА** з г.Кобрына;

**Л.Е.СТАДНІК** з вуліцы Кірава ў Мінску;

**Здзіслаў Станіслававіч БОГУШ** з Гродна (вуліца Мендзялеева);

**Барыс Нікадзімавіч СОЛТАНАЎ** з Оршы (вуліца Міра);

**Васіль Пятровіч КУХАРАЎ** з Магілёва (вуліца Планетная);

**Марыя Браніславаўна ЛОСЬ** з Гомеля (вуліца Сасновая);

**С.С.БЕЛАНОВІЧ** з Валожына (вуліца Партызанская);

**Марыя МІНЮТКА** з пасёлка Івянец Валожынскага раёна;

**Іраіда Паўлаўна КАЛЯДА** з г.Ліда (вуліца Машэрава);

**Тамара Фёдараўна ХАНЕВІЧ** з Баранавічаў (вуліца Тэльмана);

**Данута Уладзіславаўна КРУПІЦА** з г.Ліда (вуліца Міцкевіча);

**Пётр Пятровіч КРАЙКО** з Мінска (вуліца Славінскага);

**Марыя Адамаўна КРЫВАШЭЕВА** з Мінска (вуліца Матусевіча);

**Людміла Анатольеўна ТУРКОТ** з Барысава;

**Этолія Антонаўна ПАРМОН** з Мінска (вуліца Заслаўская);

**Соф'я Пятроўна РУСЕЦКАЯ** з Барысава (вуліца 50 год БССР);

**Зоя Максімаўна БІЖАН** з Мінска (вуліца Кульман);

**Віктар Іванавіч СЕНКЕВІЧ** з г.Ашмяны (вуліца Савецкая);

**Аляксандр Аляксандравіч ЗАБАЎСКІ** з Жодзіна (вуліца Аўтамабілістаў);

**С.М.БУЛАНАВА** з вёскі Кемелішкі Астравецкага раёна;

**Павел Мікалаевіч МАКАРАЎ** з Гродна (вуліца Фолюш);

**Ала Вікенцьеўна Ражкова** з Мінска (вуліца Альшэўскага);

**Яўген Васільевіч ВАРАНЯНСКІ** з Мінска (вуліца Галадзеда);

**Вольга Іванаўна КОМЛЕВА** з Мінска (вуліца Куйбышава);

**Валянціна Іванаўна ШАБУНЕВІЧ** з вёскі Бароўе Уздзенскага раёна;

**Фёдар Уладзіміравіч ПРЫГОДЗІЧ** з Мінска (вуліца Адзінцова);

**Галіна Ігнатаўна КУЧУК** з Барысава (вуліца Горкага);

**Аліна Кузьмінічна ШЫНКАРОВА** з Мінска (вуліца Ясеніна);

**Іван Фёдаравіч МІСЮКЕВІЧ** з Мінска (вуліца Галадзеда);

**Ларыса Іванаўна ЦЯРЭШКА** з Гродна (вуліца Дзяржынскага);

**В.Э.ПЕТРУШКЕВІЧ** з Гродна (вуліца Скрынніка);

**Раіса Міхайлаўна БАБКО** з вёскі Палесская Пінскага раёна (дасылала грошы два разы);

**Людміла Няфёдаўна ХЛЕБЦЭВІЧ** з Брэста (вуліца Машэрава);

**А.С.БЫСТРЫК** з Навагрудка (вуліца Гродзенская);

грошы таксама сабралі настаўнікі і вучні мясцовай школы;

**Алена Рыгораўна АЎДАСЕВА** з Віцебска (вуліца Першамайская);

**Францішка Іосіфаўна ГАРНОЎСКАЯ** з Заслаўя Мінскага раёна;

**Уладзімір Сямёнавіч АЎЛАСЕНКА** з Гродна (вуліца Камарова);

**Ірына Алегаўна СЯРГЕЕВА** з Мінска (вуліца Каліноўскага);

**Алена Вікенцьеўна ШЛЯХТУН** з вёскі Паркавая Баранавіцкага раёна;

**Ніна Мікалаеўна ЕФІМЕНКА** з Мінска (вуліца Лынькова);

**Раіса Пятроўна ГАЛАЎКО** з Баранавічаў (вуліца Скрабіна);

**Барыс Васільевіч ХІНЕВІЧ** з Мінска (вуліца Я.Маўра);

**Р.А.ШПАК** з г.Ляхавіч (вуліца Леніна);

**Ніна Канстанцінаўна ЦАРКОВА** з г.Чэрыкава (вуліца Ракасоўскага);

**Галіна Аляксандраўна ЖЫГІЛЕВІЧ** з вёскі Вішнёвая Мінскага раёна;

**Анатоль Іванавіч БУЛАК** з Мінска (праспект Газеты "Праўда");

**Марыя Аляксееўна ХАЛЬМАНОВІЧ** з вёскі Раковіч Шчучынскага раёна;

**Генадзь Генадзьевіч АДАМОВІЧ** з Гродна (Індурскае шасэ);

**В.М.ПАДДУБНАЯ** з Мінска (праспект Машэрава);

**Аляксандр Міхайлавіч ГУТОЎСКІ** з вёскі Расходна Сенненскага раёна;

**Яніна Станіславаўна АКУНЕЦ** з Бабруйска (вуліца Урыцкага).

Было таксама шмат званкоў са словамі спагады і падтрымкі. А колькі пісем, пасылак! Іх даслалі:

**Алесь Мікалаевіч БЕЛАКОЗ** з вёскі Гудзевічы Мастоўскага раёна;

**Яніна Станіславаўна АКУНЕЦ** з Бабруйска;

**М.ЮРКОЎ** з вёскі Нікольск Дрыбінскага раёна;

вучні 6 "В" класа СШ №1 г.п.Шуміліна Віцебскай вобласці;

**Марыя Леанідаўна НОВІКАВА** з вёскі Новая Мыш Баранавіцкага раёна;

**М.А.ЧАРНУШЧЫК** з Гродна (вуліца Даватара);

**І.І.ЕФІМЕНКА** з Мінска (вуліца Гараўца);

**Валянціна Адамаўна КАШЧЭЕВА** з Мінска (вуліца Кальцова);

**Марыя АКАЛОТАВІЧ** з вёскі Новая Мыш Баранавіцкага раёна;

**Валянціна Іванаўна УДОТ** з вёскі Крамяніца Дзятлаўскага раёна;

**Вольга МАЦЕРАЛЬНІК** з Мінска (вуліца Чарнышэўскага).

Дарэчы, спадарыня Вольга сказала, што кожны месяц будзе аплачваць Валодзю інтэрнет і ўжо зрабіла першы ўзнос.

Дзякуючы матэрыяльнай дапамозе мама Люба купіла Валодзю прынтэр, такія-сякія рэчы ў хату і адклала крыху грошай на "чорны дзень". Але ж хіба бываюць яшчэ чарнейшыя дні, чым у яе з Валодзем цяпер?

Пісьмы, грашовыя пераводы, званкі з добрымі спагадлівымі словамі, падобна сонечным праменьчыкам, асвяцілі іх душы. Мама і сын пераканаліся, што яны не адзінокія ў сваім горы, што ёсць шмат сяброў, якія падтрымаюць, дапамогуць. А гэта нельга пераацаніць...

Я, аўтар матэрыялу "Мама Люба і Валодзя", нізка схіляю галаву перад усімі, хто прачытаў яго і адгукнуўся. Таксама і перад тымі, хто, не маючы магчымасці дапамагчы матэрыяльна, хаця б у думках выказаў спагаду гэтым няшчасным людзям. Бясконца ўдзячна лёсу, што маю так шмат чытачоў з добрымі высакароднымі сэрцамі, што яны думаюць, адчуваюць жыццё так, як адчуваю яго сама.

Не магу не падзякаваць і шаноўнаму заснавальніку, выдаўцу і галоўнаму рэдактару "Народнай Волі" Іосіфу Паўлавічу Сярэдзічу за дабрыню, чуласць і розум, за такую цудоўную яго і нашу газету. І разам з Любоўю Луня і яе сынам Валодзем кажу: "Нізкі паклон вам, добрыя людзі!" Моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту. Няхай усіх вас ахіне сваёй ласкай Усемагутны Божа.

**Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.**

*Дзятлаўскі раён.*

**P.S.** *Прашу прабачэння, калі каго-небудзь не назвала ці дапусціла недакладнасць у прозвішчы. На некаторых квітанцыях было напісана неразборліва.*

ГНЕЎНЫ ЛІСТ

# Мой адказ недапечанаму «Кексу»

Мяне асабліва ўзрушылі ў "Народнай Волі" адказ галоўнага рэдактара так званаму "Кексу" і артыкул "Баба Шура сказала сваё слова".

А чаму б і мне не выказаць свой гнеў у адрас недапечанага "Кекса" і не прамовіць сваё слова ўслед за яркай прамовай Васіля Якавенкі, што "выратаванне мовы нашых продкаў, мовы Купалы і Коласа, Мележа і Караткевіча, Танка і Быкава, Барадуліна і Гілевіча, мовы ўсіх беларусаў, якіх хвалюе лёс Бацькаўшчыны, — святы абавязак кожнага з нас"? І, адклаўшы свае клопаты ўбок, рашыла паразважаць услых аб нашай мове, якую па сённяшні дзень (ёсць такія!) "мужыцкай завуць". Як і галоўны рэдактар "Народнай Волі" Іосіф Сярэдзіч, хачу выказаць пратэст не толькі розным "кексам", а і тым высокім чыноўнікам, якія не разумеюць, якое злачынства яны твораць, заганяючы ўсё беларускае ў кут, ганьбячы тытульны народ, дзяржаву.

Беларуская мова — родная мова майго бацькі Аляксандра, бабулі Сцепаніды, дзеда Гіляра, якога мы, яго ўнукі, ні разу не бачылі — прапаў у 1938 годзе. Мова маіх дарагіх землякоў Мсціжскага сельсавета, што на Барысаўшчыне. Але я

*...ўдзячна лірычнаму роднаму слову,*
*Прыгожым адценням і фарбам яго,*
*Удзячна я ўсім, хто данёс гэту мову*
*Да сэрца, да шчасця і лёсу майго.*

Удзячна педагогам пединститута: М.Ф.Гуліцкаму, Ф.М.Янкоўскаму і асабліва — Андрэю Андрэевічу Калядзе, які, выкладаючы мастацкае чытанне, навучыў правільнаму беларускаму вымаўленню не толькі слоў, але і кожнага гуку. А ў тэатры "Жывое слова" дзякуючы яму як кіраўніку мы навучыліся прыгожа гаварыць, выразна чытаць паэзію і прозу, паглыбілі свае веды пра мову як жывы арганізм.

"Кекс", на твой погляд, мне трэба больш даражыць рускай мовай, бо нарадзілася ў Маскве, мама мая руская, а ў маім пашпарце доўгі час значылася нацыянальнасць, абраная мне матуляй. Але ніколі не бачыла і не чула ад дарагой маёй мамачкі крыўды ці нараканняў, калі яшчэ ў восьмым класе я прыняла рашэнне прысвяціць сваё жыццё прапагандзе беларускай мовы, асабліва мілагучнай, незвычайна шчырай, асветленай добразычлівасцю нашага народа.

Колькі сябе памятаю, не аддзяляла гэтую аснову культуры ад хлеба жытняга, ад вады крынічнай, ад вымытага дажджамі паветра над лесам, што ў маім краі. І здзіўляюся, як можна, нарадзіўшыся ў Беларусі, не толькі адмаўляцца, але і грэбаваць сваёй роднай мовай? Гэта не я дзівачка, а той, хто не верыць маім, яшчэ дзявочым, натхнёным радкам:

*А я — дзяўчына з Беларусі,*
*З калыскі мятава-духмянай,*
*Адтуль, дзе кола круціць бусел,*
*Дзе кожны — госць, даўно чаканы...*

І па сённяшні дзень гэтым думкам сваім не здраджваю. Бо ўжо не проста думкі, а перакананні моцна трымаюць мяне на роднай зямлі. Не скажу, што соладка жывецца, — наадварот...

А каму зараз лёгка ў нашым краі?

Таму і не ўзнімаю пытанні асабістых бед, якія даўно скрывавілі сэрца і павялічылі яго ў памерах. Не меншая рана і пякучы боль — за родную мову. Таму і асноўная гаворка мая сёння пойдзе пра яе. Так і напрошваюцца палымяныя словы Францішка Багушэвіча: *"Божа ж мой, Божа! Што ж мы за такія бяздольныя? Якаясь маленькая Балгарыя — са жменю таго народу — якіясьці Харваты, Чэхі, Маларосы і другія пабрацімы нашыя... маюць па-свойму пісаныя і друкаваныя ксёнжачкі і газеты; і дзеткі іх чытаюць так, як і гавораць, а ў нас як бы захацеў цыдулку ці да бацькі лісток напісаць па-свойму, дык, можа б, і ў сваёй вёсцы людзі сказалі, што "піша па-мужыцку" і як дурня абсмяялі б!"*

Усе, хто вучыўся ў школе і хто вучыцца цяпер, ніяк не маглі прайсці міма вядомай "Прадмовы" да слаўнай "Дудкі беларускай" Мацея Бурачка. То чаму ж, адкуль такая чэрствая абыякавасць і нават пагарда ў "Кексаў" да мовы свайго народа? Не раз, працуючы ў школе, распавядала пра Мову як абылганую, збітую ў дарозе жанчыну. "І вось яна, — гаварыла я сваім выхаванцам, — сядзіць зараз у нашым класе, забіўшыся ў куток, схаваўшы незвычайна прыгожы тварык, баючыся, каб зноў не вартую яе годнасці пачуць чарговую грэблівую насмешку ў свой адрас. І наша задача з вамі, шаноўныя мае сябры, а я вас лічу сапраўднымі сябрамі, дапамагчы Мове нашай ачуняць, смела падняцца з калень хаця б у нашай аўдыторыі. А каб яна адужала і выйшла на вуліцу і ў кожны дом, у кожную школу, у кожную установу, будзе залежаць ад вас, як вы на працягу навучання ў школе палюбіце Яе, самую родную, самую дарагую".

З урока на ўрок прадаўжаліся падобныя гутаркі, падмацоўваліся словамі, радкамі, цэлымі перакануўчымі тэкстамі з твораў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча, Пімена Панчанкі... Гэты пералік можна доўжыць. Апрача ўрокаў і спецыяльных факультатываў, за ўвесь свой працоўны стаж арганізавала з вучнямі нямала пастановак п'ес, дзе былі задзейнічаны і настаўнікі школы, якія адначасова разам з вучнямі пераконваліся ў вартасці беларускай літаратуры. Фальклорная група, створаная яшчэ ў Лепельскім раёне, адзначалася ганаровай граматай Міністэрства СССР. У той жа час мясцовыя чыноўнікі падазрона шапталіся за спінай, а потым задавалі пытанне, як кажуць, у лоб: "А чаму ўдзельнікі вашага калектыву размаўляюць і спяваюць толькі па-беларуску?" Гэтыя ж самыя людзі здзіўляліся і паведамлялі ў належныя органы, што настаўніца беларускай мовы (гэта пра мяне) на сваіх уроках прапагандуе толькі беларускую мову, хаця сама па нацыянальнасці руская.

Я зараз не маю часу і настрою, каб пераказаць падрабязнасці тых дыялогаў, якія адбіралі і час, і здароўе, і нават жаданне жыць. Але я ні пры якіх абставінах не адмаўлялася ад разумнага, нармальнага ладу жыцця, часткай якога з'яўляецца мова бацькі майго — беларуская мова, *"што мне, як імя уласнае, блізкае і знаёмае, што па жылах маіх цячэ цёплым Сажом і Нёманам..."*

А яшчэ — маёй маленькай рачулкай Мрайкай, прытокам Бярэзіны.

*Ёсць такая вёска Мрай,*
*Мараць там, жывуць і мрояць.*
*Не зямля, скажу вам, — рай.*
*Край асілкаў і герояў.*

*Ёсць такая вёска Мсціж —*
*Першая сталіца лёсу,*
*Дзе адзначаць твой прэстыж,*
*Дзе да смерці ў сэрцах носяць.*

Так, там яшчэ жыве мая настаўніца беларускай мовы і літаратуры Марыя Іванаўна Шайкова, дзякуючы якой літаратура была маім самым любімым прадметам. І не толькі гэтая настаўніца праз гады сяброўкаю маёй стала. А і настаўніца хіміі Рэгіна Антонаўна Карніцкая — увесь час размаўляе толькі пабеларуску. Прыязджайце на Мсціж, пачуйце іх, маіх залатых, мудрых і справядлівых педагогаў, і розуму наберацеся, і ў мову сваю закахаецеся. Ну як, скажыце, здрадзіць ім?

*Больш прывабнага за праўду я*
*Нічога не прыгадваю.*
*Не хлусня з балючай здрадаю —*
*Шчырасць мяне радуе.*

А шчырэйшы ў сваіх учынках і ў сваёй гасціннасці ці знойдзеце вы народ такі, як беларусы?

І таму баліць сэрца, хвалюецца душа: колькі можна ўпрошваць, тлумачыць, каб беларусы звярнуліся да Мовы сваёй, каб не пускалі Яе на здзек розным "кексам"?! Вядомым рэферэндумам, памятаецца, зрабілі насмешку з Мовы роднай. І Яна, бедная, тады збітая і згвалтаваная сваімі ж, родненькімі, людцамі закульгала па краіне, з бояззю заходзячы ў хаты (пра ўстановы і гаворкі няма). У транспарце толькі пачуеш аб'явы прыпынкаў на роднай — і ўсё. А што? Прасцей жа гаварыць, як атрымліваецца. Хто ў нашых школах вучыць рыторыцы, правільнаму вымаўленню кожнага гуку, які "азяблай сініцай цінькае". Сапраўды, азяблай, зусім змарожанай. Толькі ж аўтар упэўнены, што нашы словы "не стануць тэрмінамі медыцынскімі". Дай Бог.

Вяртаючыся да школьнай адукацыі, хочацца падкрэсліць: настаўнікі беларускай мовы і літаратуры — на роўных з самой Мовай — "неаўтарытэтныя", як сказаў бы мой зямляк. А адкуль быць таму аўтарытэту, калі з кожным годам меншае і меншае гадзін па беларускай мове і літаратуры, калі перавага аддаецца любой замежнай, толькі не роднай. Бацькі навыперадкі адзін перад адным наймаюць рэпетытараў па іншаземнай мове. А як выхваляюцца, просячы свайго нашчадка перад сябрамі ці знаёмымі "паспікаць" ці "пашпрэхаць", а роднай гаворкі ад іх і не дачакаешся. *"А можа, і сапраўды, наша мова такая, што ёю нічога добрага ні сказаць, ні напісаць не можна? Ой не! Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная, як і другім добрым людзям, і гаворым жа мы ёю шмат і добрага".* Ну, як не згадзіцца са шчырым зваротам да нас, сваіх суайчыннікаў, праз немалы пласт гадоў, праз не адно пакаленне сапраўднага сына сваёй Радзімы, непадкупнага адваката, мудрага земляка Францішка Багушэвіча?

Напэўна, датуль, пакуль нам будуць гаварыць: "Ды хопіць вам мусоліць гэтае пытанне з беларускай мовай, хопіць яго пераціраць", — мы не ўспомнім ніводнага палымянага радка ні Купалы, які спадзяваўся на людскасць свайго народу — "людзьмі звацца", ні Багдановіча з яго адчайным перажываннем "Народ, беларускі народ, ты цёмны, сляпы, быццам крот...", ні Караткевіча:

*Там звіняць неўміручыя песні на поўныя грудзі,*
*Там спрадвеку гучыць мая мова, булатны клінок.*
*Тая гордая мова, якую й тады не забудзем,*
*Калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок.*

Як яшчэ мацней і больш пераканана сказаць?! Як давесці да свядомасці беларусаў, што на родную мову нельга забывацца, грэбаваць ёю, саромецца яе?

Мне крыўдна за свой народ, якому трэба даводзіць такую простую і зразумелую ісціну: *"Не пакідайце мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!"*

Вядома, матэрыяльныя выгоды — важна, смачна паесці — ніхто не забароніць. Такое надзённае і непрыстойна-зневажальнае "Былі б чарка і скварка" не для таго народа, у якога ўсе сямейна-бытавыя абрады да оперы блізкія, у якога казкі і чароўныя, і жартоўныя — не горшыя па мастацкай вартасці за ўсе казкі свету. Не хлебам адзіным жыве народ, які ганарыцца такімі імёнамі, як Францыск Скарына, Дунін-Марцінкевіч, Кузьма Чорны, Максім Гарэцкі, Вячаслаў Адамчык, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін... "Калі ж, — як сказаў аднойчы рускі паэт Вадзім Шэфнер, — *цябе нейкім часам не стане на свеце, піяніна тваё не заплача ніводнай струной, тэлефон не знямее і лента ўцалее ў касеце, і халадзільнік не пойдзе ў слязах за тваёю труной. Набывай, але помні, што рэч — не галоўны набытак, і не важнае месца займае ў тваёй галаве. Той, хто жыў для багацця, памрэ, і ўсімі забыты, той, хто жыў для людзей, і па смерці з жывымі жыве".* А мы разам з багаццем — праслаўляем "чарку" і "скварку". То пра якую мову і людзей клопат наш будзе? Вось таму і не знаходзяцца "зацікаўленыя дзяржаўныя органы ў рабоце па пашырэнні выкарыстання беларускай мовы ў грамадстве".

*"І яшчэ адно мяне здзіўляе,* — да маіх думак далучаецца залаты голас Беларусі, голас чалавека-эпохі, чалавека-легенды, голас "беларускага Левітана" Іллі Кургана, — *у школе нашых дзяцей вучаць правільна пісаць, а правільна гаварыць — не. А слова — гэта вялікая вынаходка чалавецтва. Яно здатнае стаць сапраўды родным. І слова мае такую моц, пра якую мы нават не здагадваемся. "Выкажыся, каб я цябе ўбачыў!" — заўважыў некалі Сакрат. Чалавек можа шмат чаго ведаць, але калі ён не валодае мовай, дык суразмоўца пачынае слухаць не тое,* ***пра што*** *яму імкнуцца сказаць, а тое,* ***як*** *гавораць. І нездарма некалі Бэла Ахмадуліна заўважыла: "Мова — гэта не толькі пісьменнасць. Мова — гэта маральнасць!".*

Я жадаю далучыць свой голас да вялікай групы вучоных, дзеячаў мастацтва, пісьменнікаў і іншых катэгорый грамадзян, якія шчыруюць над тым, каб *"запаліць "зялёнае святло" роднаму слову ў дзіцячых садках, школах, гімназіях, ліцэях, каледжах, адкрыць беларускамоўны універсітэт, інстытуты, у якіх дзеці беларусаў маглі б вучыцца на сваёй мове".*

**Вера БУЛАНДА, педагог, сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

## АД РЭДАКЦЫІ

*Нізка вершаў Веры Буланды будзе надрукавана ў адным з нумароў "Народнай Волі".*




ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

## Сколько создано агрогородков?

**Недавно побывал на "малой Родине". Щемит душу оттого, что вымирают деревни. В нашей когда-то, помню, было 250 дворов, а теперь и сотни не наберется. Зато на район несколько агрогородков построили. Интересно, а сколько их создано по всей Беларуси?**

**Михаил КРИВАЛЬ, служащий. г.Минск.**

Возведение так называемых агрогородков ведется в рамках Государственной программы возрождения и развития села. Министр сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь **Семен ШАПИРО** на днях обнародовал такую цифру: в сельской местности создано 1180 агрогородков, в которых пакет социальных благ приближен к городским.

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

## На Брэстчыне ўспамінаюць Касцюшку

У вобласці створаны аргкамітэт па падрыхтоўцы да святкавання дня нараджэння вялікага сына беларускай зямлі, кіраўніка нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 года Тадэвуша Касцюшкі. Святочныя мерапрыемствы пройдуць у доме-музеі Касцюшкі ў вёсцы Косава Івацэвіцкага раёна 4 лютага 2010 года.

Аргкамітэт плануе зрабіць гэтае свята агульнарэспубліканскім, запрасіць на яго вядомых пісьменнікаў, гісторыкаў, палітыкаў, а таксама спевакоў і бардаў.

У арганізацыйны камітэт увайшлі прадстаўнікі дэмакратычных партый, грамадскіх аб'яднанняў і прадстаўнікі культурных колаў Брэстчыны: архітэктар і доктар мастацтвазнаўства Ірына Лаўроўская, старшыня абласной арганізацы АГП Мікалай Коўш і іншыя. Кіраўнік аргкамітэта — сябра Партыі БНФ Аляксандр Мех. Калі гэтая інфармацыя вас зацікавіла, тэлефануйце арганізатарам акцыі 8-029-79-79-79-5.

**Ігар ЗАЛЕСКІ.**

## Палац пад Ваўкавыскам набыў расійскі алігарх

**Палацава-паркавы комплекс у вёсцы Краскі Ваўкавыскага раёна прададзены з аўкцыёну за 307 мільёнаў рублёў. Як паведамляе газета "Вечерний Гродно", палац набыў сабе бізнесмен з Расіі, ён збіраецца тут жыць.**

Дарэчы, спробы прадаць палац у Красках з аўкцыёну былі неаднойчы. Ранейшых удзельнікаў (дзве расійскія і баранавіцкую фірму) не задаволіла стартавая цана — 2 мільярды беларускіх рублёў. Не дапамагла і зніжка на 600 мільёнаў.

Новаму ўладальніку на ўзнаўленне панскай сядзібы далі два гады. Будаўнічыя працы ён збіраецца пачаць увесну і першапачаткова прывядзе ў парадак парк.

Дарэчы, у Ваўкавыскім раёне плануюць выставіць на продаж яшчэ адзін панскі дом. Маёнтак у вёсцы Падароск прададуць з умовай — стварыць у сядзібе агратурыстычны комплекс.

## Гасцініцу «Кастрычніцкую» ў Мінску пераробяць у пяцізоркавы гатэль

**Плануецца, што ў канцы 2011 года ў сталіцы з'явіцца яшчэ адзін пяцізоркавы гатэль.**

Гэта адбудзецца пасля рэканструкцыі гасцініцы "Кастрычніцкая", інфармуе сайт Мінгарвыканкама.

У гатэлі зробяць надбудову — дзесяты паверх. Дзякуючы абнаўленню плошча гатэля павялічыцца амаль у тры разы і складзе 37 тысяч квадратных метраў. У гатэлі з'явяцца нумары бізнес-класа. Агульная колькасць нумароў павялічыцца са 103 да 154.

Фірма, якая зоймецца рэканструкцыяй, будзе вызначана ў канцы сакавіка ў выніку конкурсу. Да гэтага ж часу пройдзе экспертызу і архітэктурны праект. Плануецца, што цалкам рэканструкцыя гатэля завершыцца ў канцы 2011 года. Пасля гэтага "Кастрычніцкая" стане самай статуснай гасцініцай у краіне.

## Футбольны клуб МТЗ-РІПА стаў «Партызанам»

**З новай назвай пачне сезон 2010 года мінскі футбольны клуб МТЗ-РІПА. Цяпер гэта будзе "Партызан".**

*"На гэты момант ідзе юрыдычная працэдура афармлення назвы. Таксама будуць выкананы ўсе наступныя дзеянні, звязаныя з перайменаваннем, у тым ліку змена лагатыпа",* — гаворыцца ў паведамленні, апублікаваным на афіцыйным сайце клуба.

У мінулым годзе на сайце было праведзена галасаванне наконт новай назвы клуба. З 5232 чалавек, якія ўзялі ўдзел у апытанні, 28,3% прагаласавалі за "Партызан", 26,4% — за МТЗ, 24,5% — за "Трактар", 7,5% — за "Арсенал" і 2,7% — за "Сталіцу".

У лістападзе дырэктар клуба Людас Румбуціс заявіў, што ініцыятыва змяніць назву клуба зыходзіць ад заснавальнікаў. "*Але нам важна ведаць думку балельшчыкаў. Ведаю, што многія выказваюцца за захаванне старой назвы. Гэта наўрад ці магчыма. Галоўная прычына перайменавання ў занадта доўгай і не зусім зразумелай абрэвіятуры*", — заявіў Румбуціс.

**Дзмітрый УЛАСАЎ, БелаПАН.**

ГДЕ ЭТО ВИДАНО...

# За что Ольга Зубко покусала чиновника Латыша?

*Пьяный водитель, скрывающийся от милиции 14 апреля 2008 года, на большой скорости врезался на грузовике в жилой дом по улице Красноармейской города Поставы. К счастью, обошлось без жертв. Но жилье превратилось в руины.*

Нарушитель Правил дорожного движения лишен на три года права вождения транспортного средства.

Без малого два года потерпевшая хозяйка обивает пороги властных структур районного и даже республиканского уровней и, конечно, предприятия ЧУП "Автобаза Поставского района", где работал любитель сесть за руль в пьяном виде.

Кстати, автобаза является структурным подразделением Поставкого райпо.

Тогдашний председатель Витебского областного союза потребительских обществ Г.Галимов вскоре после происшествия писал хозяйке разрушенного дома Ольге Зубко: мол, автомобиль был застрахован, поэтому СООО "Белконстрах" обязано возместить материальный вред.

"Страховщики", согласно заключению экспертизы ООО "Центр оценки", на имя Зубко перечислили в АСБ "Беларусбанка" филиала №230 г.Поставы аж 6.912.250 рублей.

*"Да разве за такие копейки можно вернуть дому прежний вид?"* — с досадой вопрошала Ольга Зубко. И ее легко понять, ведь был разрушен не только фундамент, но и стены и даже крыша дома. Нетрудно представить, что творилось внутри жилья.

Зубко даже не стала получать деньги от страховой компании.

*"Пусть виновные за эти гроши и восстанавливают из руин строение",* — решила потерпевшая.

Зубко пригласила независимых экспертов из Минска. Столичные специалисты насчитали 26.471.179 рублей, но эксперты денег не дают, наоборот, им надо платить за *"элементарную арифметику".*

Короче, время шло, а дом никто и не думал восстанавливать. Правда, районная власть предоставила из подменного фонда "однокомнатку" для семьи Зубко.

Пришлось Ольге Зубко обратиться в республиканский Белкоопсоюз.

Заместитель председателя правления Белорусского республиканского союза потребительских обществ Л.И.Сенько 12.11.2008 г. дал письменный ответ: *"Правлением Белкоопсоюза принято решение о восстановлении Поставским райпо поврежденного строения..."*

Поставское райпо вроде что-то сделало, но... По словам Зубко, стены перекошены, кровля в разных уровнях, дыры в потолке и полу забили ДВП, даже не утепляя.

Измученная волокитой, Ольга Зубко решила обратиться за помощью к председателю Поставского райисполкома: *"Хоть и местная, но все-таки власть!"*

25.06.2009 года заместитель председателя Поставского РИК П.Р.Станюш ответил ей: *"С целью ускорения темпов и повышения качества работ в Вашем присутствии комиссионно с приглашением специалистов районного исполнительного комитета и райпо рассмотрены все вопросы, связанные с ходом восстановления жилого дома"*.

Но Зубко говорит что в октябре ей пришлось вселяться в недостроенный "долгострой".

*"Прошло уже больше трех месяцев, а работа не завершена*, — говорит она. — *А тут, как на грех, 2 ноября 2009 года во двор явился заместитель председателя Поставского райпо В.А.Латыш. Принес подписать акт о завершении восстановительных работ. Сказал, что все члены комиссии его уже подписали и не хватает только подписи хозяев дома. Кстати, вместе с ним пришел прораб О.Мелеховец. Я ответила, что комиссия должна обследовать дом в моем присутствии, а я здесь никого не видела. И если я уже живу в доме, то как могли эти люди обследовать жилье, минуя меня? И о каком завершении может идти речь, если сруб не переложен, кровля не восстановлена, обои не переклеены, межкомнатные стены не выровнены. Одним словом, вы меня хотите надуть".*

Из материалов судебного процесса: *"Я потребовала дать мне в руки акт для ознакомления. Латыш отказал и предложил ознакомиться с актом из его рук. Он держал акт в руке, я пыталась его прочитать. Ветер шевелил лист бумаги, рука Латыша тряслась, мне было неудобно читать. Все же я взяла акт и начала читать. Увидела, что в состав комиссии включен тот самый заместитель председателя Поставского РИК Станюш и напротив его фамилии стояла подпись. Поняла, что Латыш хочет меня обмануть, ведь не может подписать Станюш акт, не удостоверившись, что все работы выполнены. Я сказала, что отнесу этот акт к председателю райисполкома. Латыш рассвирепел, вытаращил глаза и налетел на меня как коршун. Я спрятала акт под кофту, на грудь. "Комиссар", выражаясь нецензурно, начал тискать меня за голое тело, пытаясь вытащить бумагу из укромного места. Мне стало больно. Наверное, сработал рефлекс самозащиты, и я укусила обидчика за руку".*

Конечно, Ольге Зубко после такого инцидента надо было бежать в милицию, звать на помощь соседей. Но несчастная женщина проплакала всю ночь одна. Муж вынужден уезжать на заработки. Сын учится в колледже далеко от Постав. Зато "покусанный" поступил иначе...

В суде Латыш заявил, что примирение было бы возможным, если бы Зубко согласилась с проведенным, так сказать, ремонтом дома. Но судья Поставского района Романович вынесла решение о том, что Зубко умышленно, находясь с Латышем в личных неприязненных отношениях, причинила ему телесные повреждения, и подвергла штрафу в размере 10 базовых величин (350 тысяч рублей).

В правовом государстве за уничтоженную частную собственность незамедлительно последовала бы не только материальная компенсация, но и возмещение моральных издержек. Хватило бы не только потерпевшим, но и их наследникам до конца жизни. А у нас... Не зря говорят: только от жизни собачей собака бывает кусачей...

**Владимир ЖИГУЛОВ.**

*Витебская область.*

ДАСЛОЎНА

## Алег КАЧАН: «Не хочаш — прымусім»

**Міністр спорту і турызму лічыць звычайнай практыку цэнтралізаванага запаўнення спартыўных арэн.**

*"Як па-іншаму прымусіць людзей убачыць альтэрнатыву славянскаму застоллю?"* — заявіў Качан на пасяджэнні калегіі міністэрства.

Паводле яго слоў, спачатку дзейнічае адміністрацыйны рэсурс, а затым справа ідзе "па накатанай" — людзі самі пачынаюць цікавіцца спортам.

Міністр прывёў у прыклад свайго стрыечнага брата, якому "больш за 40 гадоў". *"Ён упершыню ўбачыў хакей і не ведаў, наколькі гэта цікава"*, — сказаў Качан.

**Дзмітрый УЛАСАЎ.**



## У Мінску праектуецца трэцяя лінія метро

**Пра гэта паведаміў намеснік старшыні гарвыканкама Андрэй Ясючэня.**

Гэтая лінія будзе пабудавана ў кірунку плошчы Казінца і пройдзе пад тэрыторыяй аэрапорта Мінск-1, дзе будзе будавацца мікраараён "Мінск-Сіці", пад чыгуначнымі шляхамі і будынкамі на вуліцы Маскоўскай.

*"Першая і другая лініі метро будаваліся адкрытым спосабам. Будаўніцтва такім спосабам звязана з падрыхтоўкай да працы аб'язных дарог, рыццём катлаванаў і наступным аднаўленнем тэрыторый. Трэцяя лінія будзе пабудавана практычна цалкам падземным спосабам, яна будзе праходзіць пад шматлікімі будынкамі і збудаваннямі, знос якіх эканамічна немэтазгодны"*, — сказаў Ясючэня.

Ясючэня паведаміў, што ўчастак прадаўжэння першай лініі Мінскага метрапалітэна плануецца ўвесці ў эксплуатацыю ў 2012 годзе. Пачнуць працаваць тры новыя станцыі: "Міхалова", "Грушаўка", "Пятроўшчына".

**БелаПАН.**

ОПЫТ СОСЕДЕЙ

# «Каждый бюллетень поднимается для всеобщего обозрения и объявляется, за кого отдан голос»

**Украина готовится ко второму туру соперничества за президентский пост. Своими впечатлениями о том, как проходят выборы в этой стране с читателями "Народной Воли" делится член Партии БНФ, международный наблюдатель от Европейской сети организаций по наблюдению за выборами "ENEMO" Александр МЕХ.**

Он наблюдал за тем, как выбирали президента своей страны жители Ровенской области.

— Больше всего впечатлил механизм подсчета голосов избирателей, при котором фальсификация результатов голосования просто невозможна, — говорит Александр. — Хотя стоит отметить, что и многие другие процедуры избирательной кампании в Украине коренным образом отличаются от того, как это происходит у нас, в Беларуси.



Например, накануне выборов буквально на всех украинских телеканалах постоянно шла реклама кандидатов в президенты, сами кандидаты участвовали в программах, отвечали на вопросы в прямом эфире. То есть никто никого не игнорировал, никто никому не запрещал, свобода слова гарантировалась в полном объеме.

Нет там и никакого досрочного голосования. А значит, нет того, чтобы кто-то загонял группами тех же студентов, военнослужащих и других на те же избирательные участки. Выборы проходят в один день. Все комиссии формируются по принципу: от каждого кандидата по два человека. Соответственно, пропорционально распределялись полномочия среди членов участковых и окружных комиссий.

А вспомните, как в 2006 году формировались у нас участковые и окружные комиссии. Почему бы нам, белорусам, не поучиться у украинцев?

Кстати, урны для голосования в Украине сделаны из прозрачного оргстекла. Запечатывались они специальными номерными пломбами непосредственно перед голосованием в присутствии всех членов комиссий и наблюдателей. Бюллетени были сделаны из специальной бумаги с водяными знаками и другими степенями защиты. В каждую урну перед голосованием клались контрольные листы с подписями всех членов комиссий и наблюдателей, которые выразили желание подписаться. В день голосования на избирательных участках находились как международные наблюдатели, так и наблюдатели от разных кандидатов.

**— В Беларуси тоже наблюдателям никто вроде не запрещает следить за тем, как голосуют избиратели…**

— Присутствовать они могут. Но за семь-восемь метров можно ли видеть то, как идет подсчет голосов? Например, в Украине сразу после окончания голосования и закрытия участков все члены комиссии и наблюдатели собираются вокруг столов, где после проверки сохранности пломб вскрываются урны. Подчеркну, каждый бюллетень поднимается для всеобщего обозрения и объявляется, за кого отдан голос. Складываются бюллетени, соответственно, по стопкам. Каждую стопку помимо членов комиссий пересчитывают и представители кандидатов-соперников. Так, члены комиссии от Виктора Януковича пересчитывали бюллетени, поданные за Юлию Тимошенко, а члены комиссии от Тимошенко пересчитывали голоса, отданные Януковичу.

Наблюдатели при подсчете голосов находятся в непосредственной близости от столов и им хорошо виден каждый бюллетень, а также как идет подсчет голосов. При этом наблюдатели свободно ведут кино- и фотосъемку всего процесса выборов. После подсчета оформляются протоколы с результатами голосования. Они раздаются всем членам комиссии обязательно. По первому же требованию выдаются и наблюдателям. Имея удостоверение международного наблюдателя, я, например, свободно получал для ознакомления также списки избирателей, всю документацию, которая была на избирательном участке. Присутствовал при опломбировании урн и непосредственно при подсчете голосов. На участке, где я присутствовал при подсчете голосов, по моему требованию незамедлительно был выдан протокол голосования с печатью и подписями членов комиссий. Весь процесс голосования мы снимали на фотоаппарат и видеокамеру.

В день голосования мы посетили 14 участков. Причем участки выбирали произвольно. Окружной комиссией нам были выданы адреса всех избирательных участков. Один из избирательных участков, который мы посетили, находился на территории исправительного учреждения. И здесь все комиссии были сформированы из гражданских лиц, которые являлись представителями кандидатов. Также на этом участке присутствовали и наблюдатели от кандидатов в президенты.

Думаю, что также достойно пройдет в Украине и второй тур выборов. И, в принципе, не важно, кто победит — Янукович или Тимошенко. По сути победит народ, который добился права свободно и честно выбирать руководителя своего суверенного государства. И нам, белорусам, есть чему поучиться у наших соседей.

**Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.**

## *30 кандыдатаў на 23 месцы*

*На гэтым тыдні галоўны трэнер зборнай Беларусі па хакеі Міхаіл Захараў назваў 30 кандыдатаў на паездку на Алімпіяду ў Ванкувер.*

У спіс увайшлі: **варатары** — Андрэй Мезін, Віталь Коваль (абодва — "Дынама", Мінск), Максім Малюцін ("Віцебск"), Ігар Брыкун ("Гомель"); **абаронцы** — Андрэй Антонаў, Уладзімір Дзянісаў, Андрэй Караў, Аляксандр Макрыцкі (усе — "Дынама"), Сяргей Ярковіч, Аляксандр Радзінскі (абодва — "Юнацтва"), Віктар Касцючонак ("Спартак"), Мікалай Стасенка ("Амур"), Руслан Салей ("Каларада"), Сяргей Коласаў ("Гранд Рэпідс Грыфінз"); **нападаючыя** — Алег Антоненка, Сяргей Задзяленаў, Аляксандр Кулакоў, Андрэй Міхалёў, Андрэй Стась, Дзмітрый Мялешка, Яраслаў Чупрыс, Аляксандр Бараўкоў, Канстанцін Захараў (усе — "Дынама", Мінск), Сяргей Дзямагін ("Нафтахімік"), Аляксей Калюжны ("Дынама", Масква), Канстанцін Кальцоў ("Салават Юлаеў"), Аляксей Уграў (МУС), Міхаіл Грабоўскі ("Таронта"), Андрэй Касціцын, Сяргей Касціцын (абодва — "Манрэаль").

**Алесь СВЯТЛАНІЧ.**

АЛЬТЭРНАТЫЎНЫ ПОГЛЯД

## *Не, старонка не перагорнута!*

Паважаная рэдакцыя!

Калі я сустракаў у вашай газеце лісты Казлоўскага, Пятроўскага і іншых нядобразычліўцаў незалежнай Беларусі, я быў перакананы, што друкаваць іх "Народная Воля" не павінна. Не паважаюць гэтыя людзі беларусаў. Але, прачытаўшы ў нумары за 14 снежня мінулага года ліст чарговага фантаста, "россиянина по происхождению" Уладзіслава Лупакова з Брэста пад назвай "Перевернутая страница", свой погляд памяняў. Лісты нашых нядобразычліўцаў друкаваць трэба. Трэба ведаць, хто і што думае пра нас, беларусаў, пра нашу незалежную Беларусь.

Пакуль я вагаўся, а ці варта пісаць водгук на ліст Лупакова, пачуў з тэлевізара, што Расія размясціла ў Абхазіі, у мястэчку Гудаута, сваю вайсковую базу. Расійскі каментатар без ваганняў з вялікім задавальненнем падлічваў плён, які Расія будзе мець з гэтай падзеі...

Па Лупакову, Расійскай імперыі ўжо не існуе, замест яе існуе нейкая метраполія. Захопліваючы чужыя землі і падпарадкоўваючы іншыя народы, Расійская імперыя рабіла гэта не на карысць сабе, а нават у шкоду, і выключна дзеля таго, каб заваяваныя народы саспелі для сваёй дзяржаўнасці, бо самі доўга не ведалі, як гэтую дзяржаўнасць пабудаваць. А калі, нарэшце, справа такой падрыхтоўкі скончылася, саспелыя для сваёй дзяржаўнасці і самастойнасці народы імперыі не жадаюць яе пакідаць. І тады імперыя сама, нібы курыца-квахтуха, аддзяляецца, пакідае 14 саспелых для самастойнага жыцця "куранят", набывае свой уласны нацыянальны дом і ператвараецца ў метраполію...

Такую менавіта выснову можна зрабіць, прачытаўшы ліст Лупакова. Нешта не верыцца, што ён педагог, настаўнік. Бо цяжка ўявіць, што настаўнік не ведае гісторыі, калі сцвярджае такую лухту. Нават няма з чым спрачацца, нагадваючы, што тычыцца Беларусі, пра Вялікае Княства Літоўскае, пра дзяржаўныя ўтварэнні іншых народаў, калі Расійскай імперыі нават яшчэ не існавала...

А вось пра імперскія амбіцыі сённяшняй расійскай улады напомніць трэба. Яшчэ са слоў Пуціна "будем мочить в сортире" стала ясна, што прыйшоўшыя да ўлады КДБ-ФСБ зробяць усё, каб аднавіць імперыю. Ва ўсіх краінах былога СССР метраполія актыўна дэстабілізуе сітуацыю. Яскравы прыклад — Грузія, па сутнасці захоп Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Дэстабілізацыя палітычнага і эканамічнага жыцця адбываецца і ва Украіне, прэтэнзіі на Крым і "исконный русский город" Севастопаль нават не хаваюцца. Краіны Балтыі ўвайшлі ў Еўрасаюз і НАТА, але спробы дэстабілізаваць тамтэйшае жыццё адбываюцца і там — то пад лозунгам "защиты соотечественников", то "защиты русского языка", то "защиты Бронзового солдата"... Не, з развалам СССР метраполія не стала менш агрэсіўнай і менш небяспечнай. І найперш стратэгічным напрамкам аднаўлення імперыі ёсць Беларусь...

Яшчэ з'яўляючыся прэзідэнтам Расіі, Пуцін зрабіў "адкрыццё", заявіўшы, што рускія і беларусы — адна нацыя. Такія заявы больш за бумажныя "саюзы" і ліпавыя дамовы *выдают*, гаворачы па-руску, імперцаў з галавой. Многім расійскім імперцам *"неймется"*, вельмі хочацца праглынуць Беларусь...

На сённяшні дзень рэчаіснасць такая, што Расійская імперыя жыве, ніякіх высноў з гісторыі, нават з нядаўняй, калі быў створаны, а потым распаўся СССР, расійская ўлада не зрабіла. Зноў збівае блокі і саюзы, палохае ўвесь свет, нават надала сабе права наносіць першы атамны ўдар...

Так што рана яшчэ перагортваць імперскую старонку, як дэмагагічна, а зусім не педагагічна, прапануе педагог Лупакоў.

**Аляксандр НАВУМЧЫК.**

*в. Вялікі Трасцянец Мінскага раёна.*

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

# Каб не памерці з голаду, Аляксандр Жыткевіч ледзь не прадаў сваю нырку

**Сітуацыя з настаўнікамі Міншчыны, якіх абласное начальства ад адукацыі паставіла перад выбарам: хочаш застацца на працы — выходзіш з партыі, — нагадала мне гісторыю апазіцыянера з Віцебскай вобласці Аляксандра Жыткевіча. Гісторыю, якая паказвае, чым рызыкуюць тыя, хто жыве ў раёне і па той ці іншай прычыне згубіў працу. А тым больш тыя, хто асмеліўся выказаць нязгоду з "лініяй партыі".**

Без работы зубны фельчар з вёскі Бычыхі Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці Аляксандр Жыткевіч сядзеў амаль сем месяцаў. Летам мінулага года "Народная Воля" пісала пра яго. Тады Аляксандр быў беспрацоўным другі месяц, усе спробы знайсці работу не мелі поспехаў, і ад адчаю малады чалавек абвясціў галадоўку.

Сітуацыя гэта была складаная, неадназначная. Справа ў тым, што працы Аляксандр Жыткевіч пазбавіўся пасля суда. Маладога фельчара, які не паспеў і года адпрацаваць пасля заканчэння Аршанскага медыцынскага каледжа, абвінавацілі ў атрыманні "ўзнагароды" ад пацыента. Аляксандра судзілі, пакаралі абмежаваннем волі на тры гады і на два пазбавілі права займацца медыцынскай дзейнасцю. З працы фельчара звольнілі амаль адразу пасля абвяшчэння прысуду. Жыткевіч сцвярджаў, што справу сфабрыкавалі, што такім чынам раённае кіраўніцтва адпомсціла яму за грамадзянскую пазіцыю: Жыткевіч патрабаваў ад мясцовай вертыкалі выконваць указ прэзідэнта аб забеспячэнні маладых спецыялістаў жыллём, пісаў лісты ў аблвыканкам, Адміністрацыю прэзідэнта, адным словам, не даваў чыноўнікам спакойна жыць. Дый яшчэ падчас парламенцкай выбарчай кампаніі 2008 года без узгаднення з мясцовай вертыкаллю стаў незалежным назіральнікам, потым напісаў заяву аб уступленні ў Партыю БНФ.

Меў рацыю Аляксандр ці не — не гэта тады было галоўнае. Мы, журналісты, звярнулі ўвагу на іншы факт: Аляксандр Жыткевіч не мог уладкавацца на працу, нават... пастухом. Не дапамагалі і рэкамендацыі мясцовага Цэнтра занятасці. Нам удалося тады датэлефанавацца да дырэктара СПК "Сцяпанавічы" Гарадоцкага раёна і запытацца, чаму ён не ўзяў на працу Жыткевіча, калі ў гаспадарцы ёсць свабодныя вакансіі жывёлаводаў. Ведаеце, што адказаў начальнік: маўляў, у Жыткевіча іншая спецыяльнасць; медыцына і сельская гаспадарка — гэта розныя рэчы. Ну не зможа фельчар пасвіць кароў, і ўсё тут! А тое, што чалавеку няма за што жыць, гэта, відаць, толькі ягоныя асабістыя праблемы...

Відавочна, што ад такіх бязглуздых адказаў стаміўся і сам Аляксандр. І тады ў ліпені ён вырашыў распачаць галадоўку. Безумоўна, гэта быў крок адчаю. Але што заставалася рабіць? У кішэні 100 рублёў, не выплачаны крэдыт за тэлевізар, пусты халадзільнік. Чакаць дапамогі ад родных не выпадала: бацькоў у Аляксандра няма, ён дзетдомавец, адзіная сястра адна выхоўвае непаўналетняе дзіця.

Здавалася, што галадоўка не была дарэмнай. Жыткевіча ўзялі на выпрабавальны тэрмін у Гарадоцкі лясгас. Але... у пастаяннай працы яму ўсё роўна адмовілі. Усяго за сем месяцаў Аляксандру адмовілі ў 12 арганізацыях. Выжываў, дзякуючы падтрымцы сястры і салідарнасці мясцовых актывістаў, якія нават стварылі камітэт падтрымкі.

— Але я разумеў, што так доўжыцца не можа, — кажа Аляксандр. — Сястра выплачвае мой крэдыт, чужыя людзі даюць грошы на ежу. Але ж я здаровы чалавек, хачу і магу працаваць.

18 снежня Аляксандр звярнуўся ў раённую газету "Гарадоцкі веснік" і абласную "Віцебскі рабочы" з просьбай надрукаваць за кошт рэдакцыі яго кароткую аб'яву: "Прадам нырку".

— Заяву не надрукавалі, у рэдакцыі "Віцебскага рабочага" спасладіся на тое, што мая заява супярэчыць нарматыўным дакументам, якія рэгулююць прававую дзейнасць СМІ, — расказвае Аляксандр. — Але да сябе на размову мяне запрасіў старшыня райвыканкама Анатоль Мароз. Сабралі камісію, імкнуліся мяне зрабіць вінаватым, хаця аргументаў ніякіх не прыводзілі. Скончылася размова тым, што прапанавалі месца бетоншчыка-плотніка ў Гарадоцкім ПМК-51. З канца снежня там працую, заробак пакуль не атрымаў, картку пластыкавую раблю.

— Не трэба асуджаць настаўнікаў, якія выйшлі з АГП, — філасофскі заўважае сёння Аляксандр. — Быць моцным, калі на цябе ціснуць і калі ты ўяўляеш, што заўтра рэальна можаш застацца без сродкаў да існавання, вельмі складана. Асабліва, калі калегі, сябры не выказваюць адкрытай салідарнасці. Адна справа, калі табе тэлефануюць і кажуць: малайчына, трымайся, я за цябе. І іншая, калі тое ж кажуць публічна... У Мінску, абласных цэнтрах, можа, крыху лягчэй, там больш аднадумцаў, там можна стаць нібы невідочным, лягчэй уладкавацца на працу. А ў раёне, і тым больш на вёсцы, усё вельмі складана. Людзі ўсяго баяцца, думаюць толькі за сябе. Скажу шчыра, мяне падтрымлівалі только два чалавекі: мая сястра і гарадоцкі актывіст Леанід Гаравы.... А ўлады гэтым карыстаюцца. Цябе, падкрэсліваю, выкінуць адусюль і зробяць так, што і ў судзе ты нічога не даб'ешся.

**Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.**

ГРОМКОЕ ДЕЛО



# Суд над бандой

*В Минском городском суде рассматривают уголовное дело одной из самых дерзких и циничных банд, которая действовала в Беларуси с 1996-го по 2001 год. Они убивали, грабили, вымогали, брали заложников...*

...В октябре 2001 года около девяти часов утра неизвестные позвонили **Светлане Тавловской** *(имя и фамилия изменены)* и сказали, что если она не передаст им 500 тысяч долларов, то ее сына убьют. Для пущей убедительности бандиты, совсем как в кино, дали шокированной матери послушать голос малолетнего сына, который утром, как ни в чем не бывало, ушел в школу. Обращение мальчика к матери преступники записали на мобильный телефон накануне — несколько дней они выслеживали ребенка, изучали его распорядок дня. Бандиты твердили, что если денег не будет, то мальчика убьют — введут смертельную дозу наркотика...

...Декабрь 1996 года. **Андрей Морозевич** (*имя и фамилия изменены*), который зарабатывал себе на жизнь обменом валюты, после трудового дня возвращался домой. Автоматические ворота гаража еще не успели закрыться, как на него наставили пистолет неизвестные в масках. Они требовали отдать наличность. А в авто лежала приличная даже по сегодняшним временам сумма — около 30 тысяч долларов. Морозевич попытался оказать сопротивление. Он даже схватил одного из бандитов и, прикрывшись им, попытался выбраться из гаража через запасной выход. Но не вышло: второй мерзавец в маске хладнокровно прострелил ему ногу. После нападавшие разбили стекло автомобиля, забрали кучу денег и скрылись...

Это далеко не все эпизоды, за которые придется ответить **П.Анацкому, О.Воложинцу, Д.Пилипцевичу, А.Сороко, В.Якимовичу, А.Бобкову, А.Мурашко, И.Капылову.** Именно они сегодня дают показания в Минском городском суде.

Молодые, крепкие парни. На вид всем примерно от 30 до 40 лет. У многих наверняка есть семьи, дети. В судебном зале они сидят в клетке под усиленной охраной. Когда один из них рассказывал о деталях убийства человека, другой, по прозвищу Банан, пытался геройски подмигивать барышне в зале. Кстати, если верить прозвучавшим в суде показаниям его же товарища-подельника, именно Банан сделал контрольный выстрел в голову уже раненному охраннику, который пытался предотвратить разбойное нападение на дом предпринимателя в деревне Цна Минского района...

Раскаялись ли парни в содеянном?

Один из них — Капылов, ранее уже судимый за хулиганство и разбой, явился с повинной. Правда, случилось это почти через семь лет после того, как он выстрелил в человека. Сказал, что *"внутри тяжело было, не мог с этим жить"*.

*"Мне предложили заработать денег*, — рассказывал во время допроса в суде Капылов. — *Сказали, что есть "тема": зайти в дом богатого человека, положить всех присутствующих на пол с помощью оружия и потребовать денег. Я согласился*".

Нападение на дом предпринимателя **Игоря Данилюка** *(имя и фамилия изменены*) планировали несколько дней. Судя по тому, что прозвучало в суде, один из обвиняемых раньше был знаком с Данилюком, поэтому он к дому предпринимателя близко не подъезжал, опасаясь, что его узнают.

*"Мы несколько раз выезжали на место преступления,* — вспоминал Капылов. — *Смотрели, как можно удобно зайти в дом, кто и когда там бывает. Дом напоминал большой замок. Надо было под каким-нибудь предлогом посмотреть, что там внутри. Я зашел — дверь была открыта. Мне навстречу вышла симпатичная девушка, что-то сказала... За день до нападения мы еще раз выезжали на место..."*

Однако в день преступления все пошло не так, как было запланировано. Недалеко от дома Данилюка, который не был обнесен забором, парни наткнулись на охранника **Виталия Маслова**. Маслов, видимо, потребовал, чтобы парни удалились с охраняемой территории. Между ними завязалась перепалка.

*"Увидев, что охранник начал доставать что-то из-за пазухи, я его окликнул, но он не услышал,* — говорит Капылов.— *Тогда я расстегнул куртку и выстрелил 2—3 раза в его сторону. Рассчитывал попасть в забор или мусорный бак, чтобы просто привлечь его внимание. Если бы выстрелил в воздух, то он не услышал бы, потому что пистолет был с глушителем. А когда увидел, что охранник начинает оседать, понял, что куда-то ему попал... Оставаться на месте смысла не было, тем более что как раз вышел хозяин дома. Он что-то говорил, кричал, я не помню. Я развернулся и побежал к машине. Кинул пистолет в авто, сказал, что, наверное, попал в охранника. Возле машины меня вырвало... Мы подождали минут 3—5 остальных и уехали"*.

Уже после кто-то из товарищей попытался морально поддержать Капылова: мол, ты не переживай, мы выстрелили ему в голову или в живот, чтобы он в случае чего не опознал нас...

*"Какое-то время после этого преступления мы не созванивались",* — сообщил на суде Капылов. По его словам, зайти в дом Данилюка без оружия, например, когда там никого не будет, не было возможности.

*"Женщина с ребенком все время была дома",* - сказал он.

*"Я признаю, что его убил,* — сказал Капылов. — *Но это было убийство по неосторожности"*.

Пистолет "Скорпион", из которого стреляли в охранника, по словам Капылова, его товарищи должны были или утопить, или закопать.

Жена и мать убитого Виталия Маслова говорят, что у него был перелом черепа — кто-то из бандитов ударил его металлической трубой по голове, а потом еще пытались зачем-то оттащить труп с места убийства...

*"В день убийства меня не было в Минске*, — сдерживая слезы, рассказывала в суде мать убитого Маслова Людмила Георгиевна. — *Я была в командировке в Перми. Ехать не хотела, так Виталик меня еще перед дорогой успокоил... Он вообще был такой... Мог поддержать в сложную минуту, разделить и горе, и радость.*

*О своих делах Виталик рассказывать не любил. У меня было какое-то нехорошее предчувствие, я ему говорила: смени работу, эта не для тебя. Он только отмахивался: мол, мама, у меня все нормально, не переживай..."*

На вопрос судьи, готова ли она предъявить обвиняемым гражданский иск, мать убитого охранника, немного помолчав, ответила: *"А что с них возьмешь, с отморозков?.. Это же не люди, это отморозки..."*

...Как сообщал телеканал ОНТ, в арсенале банды было современное оружие — пистолет-пулемет "Скорпион", газовый пистолет "Вальтер", переделанный под боевой, пневматический пистолет, электрошокер и бейсбольная бита. Потерпевшими по делу признано более 15 человек...

Судебные слушания начались в конце минувшего года и проходят в открытом режиме.

"Народная Воля" вернется к этой теме после вынесения приговора.

**Марина КОКТЫШ.**

**БЛИЦ-КОММЕНТАРИЙ**

## *Ирина СЕРЕБРЯКОВА, подполковник милиции в отставке: «Тогда времена были такие...»*

— Сейчас у нас уже более-менее навели порядок, и мне кажется, что таких организованных банд в Беларуси не осталось, — *высказывает свое мнение Ирина Михайловна.* — "Морозовскую" группировку уничтожили, о других вроде сейчас не слышно. А вот в те времена на самом деле был разгул бандитизма. И заложников брали, и в бизнесе друг друга "кидали". Скачок преступности в 1996—1998 годы был огромный...

После взрыва, который случился на День независимости пару лет назад, почти всех мужчин дактилоскопировали, и сейчас многие сто раз подумают, идти на преступление или нет. Но зато сейчас есть другие проблемы, связанные, например, с той же выдачей преступников, которые скрываются в других странах...

## *Наталлю Ільініч просяць забраць заяву з пракуратуры*



"Народная Воля" па просьбе чытачоў вырашыла пацікавіцца лёсам настаўніцы з Талькі Наталлі Ільініч, якая першая публічна расказала пра тое, як начальніца Упраўлення адукацыі Мінскай вобласці Таіса Данілевіч прапаноўвала ёй і яе калегам выбіраць: альбо сяброўства ў апазіцыйнай партыі, альбо праца. Наталля і настаўнік з Нясвіжа Алесь Язвінскі пасля той скандальнай гутаркі звярнуліся з заявай у пракуратуру Мінскай вобласці.

— У аўторак вечарам да мяне прыходзіла маці адной вучаніцы і прасіла, каб я забрала заяву з пракуратуры, — расказала Наталля. — Быццам бы дырэктара нашай школы зноў выклікала да сябе Данілевіч і прасіла паўплываць на мяне, з тым каб я забрала заяву з пракуратуры. Сама дырэктар мне нічога не казала, а вось бацькі... Прычым, як я зразумела з гэтай гутаркі, бацькам сказалі, што з-за мяне могуць закрыць школу і нашых дзяцей перакінуць у Блужскую. Я тлумачу, што адна няўгодная ўладам настаўніца не можа быць прычынай закрыцця цэлай школы. Іншая справа, што абласное ўпраўленне адукацыі хоча зрабіць у Блужскім аграгарадку ўзорную школу і напоўніць яе вучнямі Талькаўскай школы, закрыўшы яе. Сёння ў Тальцы навучаецца каля 70 дзяцей, а ў Блужы — каля 50...

Такая вось сітуацыя. Быццам бы мяне і не чапаюць: з працы не звольнілі, хаця я застаюся сябрам Партыі БНФ, але і даюць зразумець, што пра мяне помняць...

**Ігар ЗАЛЕСКІ.**

КОРОТКО

## *Мир отдал дань памяти жертвам Освенцима*

65 лет назад советские войска освободили узников фашистского концлагеря Аушвиц-Биркенау (Освенцим). А 1 ноября 2005 года Генеральная Ассамблея ООН приняла резолюцию, в которой постановила, что день 27 января будет ежегодно отмечаться как Международный день памяти жертв Холокоста.

В связи с этим весь мир отдал дань памяти жервам Холокоста. Канцлер Германии Ангела Меркель накануне встретилась с бывшими узниками концлагеря и выступила перед молодежью с призывом никогда не забывать трагическое прошлое.

Президент Израиля Шимон Перес выступил с речью перед депутатами парламента ФРГ. Накануне он встретился с президентом страны Хорстом Кёлером. Лидеры возложили цветы к мемориалу на перроне №17 на берлинском вокзале Груневальд, откуда в годы войны евреев отправляли в лагеря смерти.

Глава российского правительства Владимир Путин встретился с главным раввином России Берлом Лазаром и выразил благодарность еврейским организациям за сохранение памяти о нацистских преступлениях среди тех, кто, по словам российского премьер-министра, пытается исказить историческую правду.

В крупнейшем из фашистских концлагерей Освенциме погибло, по разным оценкам, от 1,5 до 2,2 миллиона человек. Точное количество погибших в Освенциме так и не удалось установить, поскольку многие документы были уничтожены. Как свидетельствуют документы Нюрнбергского трибунала, погибло 2,8 миллиона человек, 90 процентов из которых были евреи.

## *Убегают*

Сотрудник дипломатической миссии КНДР в Эфиопии сбежал в Южную Корею и попросил у официального Сеула политического убежища, сообщает AFP. За последние 50 лет в Южную Корею сбежали около 17 тысяч северокорейцев, однако дипломатов и других официальных лиц КНДР среди них было крайне немного, отмечает агентство.

## *Мексика обошла США по числу толстых граждан, заняв первое место в мире*

Первое место в мире по количеству граждан с избытком веса заняла Мексика, потеснив по этому показателю США. В связи с этим мексиканские власти заключили с рядом местных компаний соглашение для борьбы с чрезмерной тучностью населения, сообщил накануне президент Фелипе Кальдерон.

